ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 101 (2267)
24 снежня 1968 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

М. ІСАКОЎСКІ, Я. МАЗАЛЬКОЎ, А. ПРАКОФ'ЕЎ, Я. ХЯЛЕМСКІ — ЗАСЛУЖАНЫЯ ДЗЕЯЧЫ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР за заслугі ў галіне мастацкага перакладу твораў беларускіх пісьменнікаў на рускую мову і вялікую работу па прапагандзе беларускай савецкай літаратуры ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры Беларускай ССР прысвоена Ісакоўскаму Міхаілу Васільевічу, Мазалькову Яўгену Сямёнавічу, Пракоф'еву Аляксандру Андрэевічу, Хялемскаму Якаву Айзікавічу.

ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

Кампазітары і музыказнаўцы Савецкага Саюза, якія сабраліся з усіх канцоў нашай краіны на свой IV Усесаюзны з'езд, шлюць гарачае, сардэчнае прывітанне роднай Камуністычнай партыі, яе ленінскаму Цэнтральнаму Камітэту!

Мы зведваем пачуццё велізарнай удзячнасці партыі і ўраду за высокую ацэнку нашай работы. Узнагароджанне Саюза кампазітараў ордэнам Леніна абавязвае нас да яшчэ больш напружанай і плённай працы. Усе нашы творчыя сілы мы накіруем на выкананне задач, якія выстаўляе партыя перад дзеячамі сацыялістычнай культуры.

Яшчэ на заранку нашай дзяржавы, у адным з першых дэкрэтаў Савецкага ўрада, падпісаных Уладзімірам Ільічом Леніным, было сказана аб «дзяржаўным музычным будаўніцтве». Музыка заклікана была ўносіць свой важкі ўклад у фарміраванне сацыялістычнага ўкладу жыцця. І далей партыя нязменна адзначала велізарнае значэнне музычнага мастацтва ў справе выхавання гарманічна развітай асобы будаўніка камуністычнага грамадства.

У імя гэтай мэты ў нашай краіне створаны ўсе ўмовы для паспяховай творчай дзейнасці савецкіх музыкантаў. Ведаючы, як жывуць і працуюць нашы калегі ў капіталістычных краінах, мы з упэўненасцю можам сказаць: ні ў адной з гэтых краін няма такіх спрыяльных умоў для мастацкай творчасці, як у нашай сацыялістычнай дзяржаве.

Нястомныя клопаты партыі аб ідэйнай чыстаце, гуманістычнай накіраванасці нашага мастацтва, аб яго сапраўдным дэмакратызме і цеснай сувязі з народам выражаюць імкненні лепшых прадстаўнікоў савецкай мастацкай інтэлігенцыі. Музыка наша пісалася і пішацца не для вузкага кола эстэтаў, а для найшырэйшых працоўных мас, чые запатрабаванні, густ да сапраўды таленавітага мастацтва растуць з дня ў дзень. Нашаму мастацтву заўсёды ўласцівы быў зварот да самых актуальных тэм сучаснасці; яму заўсёды былі ўласцівыя камуністычная ідэйнасць, жыццесцвярджальны пафас, высокая чалавечнасць і эмацыянальная ўсхваляванасць.

Слухаючы творы савецкай музыкі, мільёны людзей на ўсім зямным шары пераконваюцца ў невычарпальных магчымасцях мастацтва сацыялістычнага рэалізму. Ілжывыя, беспадстаўныя сцвярджэнні тых буржуазных эстэтаў, якія спрабуюць усяляк дыскрэдытаваць наша мастацтва. Поспехі савецкай музыкі на жывых прыкладах даказваюць велізарную сілу сацыялістычнага рэалізму, які грунтуецца на прынцыпах партыйнасці і народнасці, спалучае вернасць класічным традыцыям са смелым наватарскім пошукам, праўдзіва адлюстроўвае жыццё ў яго рэвалюцыйным развіцці, у гістарычнай перспектыве.

Год ад году развіваюцца сувязі паміж кампазітарамі сацыялістычнай садружнасці, умацоўваецца наша адзінства. Ворагам ніколі не ўдасца ўнесці раскол у дружную сям'ю народаў сацыялістычнага лагера, пасеяць сярод іх варожасць. Савецкія кампазітары горача адабраюць знешнепалітычную лінію нашага ўрада і вітаюць прыняццё ім своечасовых мер супраць каварных планаў імперыялістычнай рэакцыі ў адносінах да Чэхаславакіі. Верныя свайму інтэрнацыянальнаму абавязку, мы — з доблеснымі воінамі дэмакратычнага В'етнама, з усімі, хто змагаецца супраць сіл імперыялізму. Ідэалогія капіталістычнага свету, ахопленага цяжкім духоўным крызісам, нам глыбока чужая. Асуджаны на правал усе спробы імперыялістычнай прапаганды аказаць ідэйны ўплыў на некаторую частку савецкай мастацкай інтэлігенцыі, асабліва моладзі.

Думкі і сэрцы савецкіх музыкантаў — з нашым народам, які будуе камунізм!

Мы запэўніваем Цэнтральны Камітэт КПСС, што прыкладзём усе свае сілы для стварэння новых твораў, блізкіх і дарагіх нашаму народу, здольных выхоўваць у ім высокія ідэйныя і маральныя якасці, умацоўваць яго патрыятычныя пачуцці. Усведамляючы ўсю паўнату адказнасці за справу музычна-эстэтычнага выхавання, мы будзем штодзённа ўдзельнічаць у арганізацыі масавай музычнай асветы, асабліва сярод дзяцей і юнацтва.

Новымі высокамастацкімі творамі, прысвечанымі бясконца дарагому нам правадыру рэвалюцыі, мы рыхтуемся дастойна сустрэць 100-годдзе з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна.

Няхай і ў далейшым умацоўваецца і ўдасканальваецца савецкая музыка, якая нясе ўсяму свету вялікія ленінскія ідэі, вялікую праўду аб жыцці нашай краіны.

Няхай і далей служыць яна жывым увасабленнем сапраўднага гуманізму і высокай духоўнай культуры сацыялістычнага грамадства.

Няхай жыве савецкі народ, які перамагаснова ажыццяўляе светлыя ідэалы ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва!

Няхай жыве Камуністычная партыя Савецкага Саюза, якая вядзе нашу краіну да перамогі камунізма!

IV УСЕСАЮЗНЫ З'ЕЗД КАМПАЗІТАРАЎ

ОРДЭН ЛЕНІНА — НА СЦЯГУ САВЕЦКІХ КАМПАЗІТАРАЎ

IV УСЕСАЮЗНЫ З'ЕЗД КАМПАЗІТАРАЎ ЗАКОНЧЫЎ СВАЮ РАБОТУ

20 снежня ў Маскве закончыў сваю работу IV Усесаюзны з'езд кампазітараў. Ранішняе пасяджэнне пачалося ўрачыстай цырымоніяй уручэння Саюзу кампазітараў СССР ордэна Леніна. Член Палітбюро ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. В. Падгорны абвясціў Указ аб узнагароджанні Саюза кампазітараў вышэйшай узнагародай Радзімы. Ад імя Цэнтральнага Камітэта КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і Савецкага ўрада М. В. Падгорны сардэчна павіншаваў дэлегатаў з'езда, усіх дзеячоў савецкага музычнага мастацтва з высокай узнагародай і пажадаў ім новых творчых поспехаў.

— Дзеячы савецкай музычнай культуры, — сказаў М. В. Падгорны, — звяртаюцца сёння да мільёнаў людзей. Гэта накладвае на нашых кампазітараў асаблівую адказнасць. Народ чакае ад іх новых значных твораў, якія па ідэйнай перакананасці і высокаму мастацкаму майстэрству знаходзілі б шлях да сэрца кожнага чалавека, пакаралі і натхнялі глыбінёй і праўдзівасцю.

Пад гром апладысментаў прысутных М. В. Падгорны прымацоўвае ордэн Леніна на сцягу Саюза кампазітараў СССР.

Са словамі ўдзячнасці партыі і ўраду за гэтую высокую ўзнагароду выступіў першы сакратар праўлення Саюза Ц. Хрэннікаў.

Дэлегат з'езда В. Салаўёў-Сядой зачытвае тэкст прывітальнага пісьма IV Усесаюзнага з'езда кампазітараў Цэнтральнаму Камітэту КПСС.

Затым былі падведзены вынікі выбараў новага складу праўлення Саюза кампазітараў СССР і цэнтральнай рэвізійнай камісіі Саюза. Была прынята пастанова з'езда. У ёй гаворыцца, што IV Усесаюзны з'езд кампазітараў выказвае сардэчную ўдзячнасць Цэнтральнаму Камітэту КПСС за высокую ўзнагароду і запэўнівае партыю і ўрад, што Саюз кампазітараў накіруе ўсю сваю дзейнасць на выкананне задач, якія ставяць перад ім партыя і народ.

На з'ездзе выбрана праўленне Саюза кампазітараў СССР. Ад калектыву беларускіх кампазітараў у яго ўвайшлі А. Багатыроў, Г. Вагнер, Р. Шырма.

У склад цэнтральнай рэвізійнай камісіі ўвайшоў беларускі кампазітар Ю. Семяняка.

Выбраны сакратарыят праўлення Саюза кампазітараў СССР у складзе 33 чалавек. У яго ўвайшлі: М. Абдраеў, А. Баланчывадзе, Э. Бальсіс, А. Джабараў, Н. Жыганаў, В. Загорскі, Д. Кабалеўскі, К. Караеў, А. Куліеў, Б. Кырвер, А. Мачаварыяні, Э. Мірзаян, В. Мурадэлі, А. Пахмутава, А. Пятроў, Г. Раманс, Е. Рахмадзіеў, П. Савінцаў, Ш. Сайфуддзінаў, Г. Свірыдаў, М. Скорык, В. Салаўёў-Сядой, О. Тактакішвілі, А. Філіпенка, А. Хачатуран, А. Холмінаў, Р. Шырма, Д. Шастаковіч, А. Штагарэнка, Р. Шчадрын, А. Эшпай, Б. Ярустоўскі.

Першым сакратаром праўлення Саюза кампазітараў СССР абраны Ц. Хрэннікаў, старшынёй рэвізійнай камісіі — Ю. Аляксандраў.

ХЛЕБ-СОЛЬ ТАБЕ, ІМЯНІННІЦА!

МАСКВА ВІТАЕ ПАСЛАНЦОЎ БЕЛАРУСІ

І ХЛЕБ-СОЛЬ, і кветкі, і памятныя падарункі прымалі пасланцы Беларусі — прадстаўнікі грамадскасці, пісьменнікі, майстры мастацтва нашай рэспублікі — ад гасцінных масквічоў у дні ўрачыстасцей, прысвечаных 50-годдзю БССР і КПБ.

Амаль увесь мінулы тыдзень гасцявала ў сталіцы Краіны Саветаў наша слаўная імяніннліца — ардэнаносная Беларусь. На ўрачыстых мітынгах, сустрэчах, вечарах, што адбываліся ў гэтыя дні, яе пасланцы расказвалі масквічам пра слаўны гістарычны шлях сваёй рэспублікі, пра яе гераічнае змаганне з ворагам у гады Вялікай Айчыннай вайны, пра сённяшні працоўны будзень беларускага народа, пра велізарны эканамічны і культурны ўзлёт Беларусі за гады Савецкай улады, пра выдатныя дасягненні нашай літаратуры і мастацтва, пра палітычныя, эканамічныя і культурныя сувязі БССР з зарубежнымі краінамі.

Увесь гэты час члены беларускай дэлегацыі былі ў атмасферы шчырай гасціннасці, братэрскай прыязнасці, святочнасці. Масквічы сустракалі беларусаў, як самых дарагіх гасцей, ад сэрца радаваліся поспехам Беларусі, усхвалявана гаварылі пра Беларусь-партызанку і Беларусь-працаўніцу, прасілі перадаць беларускаму народу, усяму нашаму лясному і азёрнаму краю гарачыя братэрскія прывітанні, віншаванні са святам і пажаданні новых працоўных і творчых поспехаў.

З захапленнем віталі нашы браты і сябры прадстаўнікоў беларускай літаратуры і мастацтва — пісьменнікаў, спевакоў, танцораў і музыкантаў Беларусі, каму выпаў гонар трымаць юбілейную справаздачу ў сталіцы Савецкай краіны.

Усе вечары і сустрэчы, што адбываліся ў Маскве з 15 па 19 снежня, былі сведчаннем добрых пачуццяў і вялікай павагі слаўнага горада да нашай Беларусі.

Нагадаем найбольш значныя з гэтых сустрэч. Пасля вялікага ўрачыстага вечара, што адбыўся ў Калоннай зале Дома саюзаў 17 снежня, новыя сяброўскія сустрэчы праходзілі 18 снежня. У гэты дзень гасцей з Беларусі прымалі маскоўскія аўтазаводцы. На завод імя Ліхачова прыехалі сакратар ЦК КПБ Ф. Сурганаў, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Р. Кісялёў і прадстаўнікі грамадскасці рэспублікі. Урачысты мітынг, прысвечаны 50-годдзю БССР і КПБ, стаў яркай маніфестацыяй любві і павагі рабочага класа Масквы да нашай рэспублікі.

18 снежня пасланцоў Беларусі віталі ў сваім клубе маскоўскія пісьменнікі.

А 19 снежня беларускія пісьменнікі і майстры мастацтва наведалі Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС.

У кабінеце рэктара адбылася цёплая задушэўная гутарка. Рэктар акадэміі У. Малін гаварыў аб сваёй даўняй прывязанасці да Беларусі, прыгадаў гады, калі ён быў сакратаром ЦК Кампартыі рэспублікі і намеснікам начальніка Цэнтральнага штаба партызанскага руху. Рэктар пазнаёміў гасцей з вучэбнай і навуковай працай акадэміі, расказаў пра яе сувязі з сусветным камуністычным рухам.

Потым у актавай зале акадэміі адбылася вялікая ўрачыстая сустрэча прадстаўнікоў беларускай літаратуры і мастацтва з выкладчыкамі і слухачамі. Беларускіх гасцей віталі будучыя партыйныя работнікі, сыны многіх савецкіх рэспублік і замежныя сябры Беларусі — навучэнцы сацыялістычных краін, якія прыйшлі на гэтую сустрэчу, каб бліжэй пазнаёміцца з літаратурай і мастацтвам нашай рэспублікі, пачуць беларускае слова і песню.

Слова — беларускім гасцям. А. Савіцкі расказаў прысутным аб шляхах развіцця і сучасным стане беларускай літаратуры, аб новых творчых поспехах сваіх таварышаў па пяру. Выкладчыкі і слухачы акадэміі цёпла сустракалі выступленні пісьменнікаў І. Мележа, Э. Агняцвет, С. Грахоўскага, Е. Лось, М. Калачынскага, А. Макаёнка, Г. Бураўкіна, Р. Барадуліна, М. Ткачова, студэнтаў літінстытута І. Ласкова і Я. Крупенькі. Па тым, як чуйна рэагавала аўдыторыя, было відаць, што прысутныя добра разумеюць мову беларускіх сяброў.

У сустрэчы прынялі ўдзел таксама калмыцкі паэт М. Хонінаў, намеснік старшыні Савета па беларускай літаратуры пры Саюзе пісьменнікаў СССР М. Гарбачоў і кансультант па беларускай літаратуры Саюза пісьменнікаў СССР В. Шчадрына.

У заключэнне вечара гаспадары перадалі беларускай дэлегацыі юбілейны віншавальны адрас і скульптурны партрэт У. І. Леніна. На памяць аб сустрэчы беларускія пісьменнікі паднеслі ў дарунак слухачам акадэміі партрэты Янкі Купалы і Якуба Коласа, а таксама альбом «Узняты з руін».

Сустрэча закончылася вялікім канцэртам майстроў мастацтва Беларусі. У ім прынялі ўдзел народная артыстка СССР Т. Ніжнікава, жаночая вакальная група Беларускага народнага хору, артысты Белдзяржфілармоніі заслужаны артыст рэспублікі Г. Мартынаў і артыстка Л. Касцеўская, заслужаны артыст БССР М. Шышкін і інш.

Вечарам 19 снежня адбылася яшчэ адна сяброўская сустрэча — у Палацы культуры пасёлка Дзяржынскае Любярэцкага раёна.

Надзвычай гасцінна сустрэлі беларускую дэлегацыю працоўныя прамысловага пасёлка. Работніца аднаго з мясцовых прадпрыемстваў В. Мірончык страчала гасцей хлебам-соллю. Яна звярнулася да пасланцоў Беларусі на іх роднай мове:

— Горача віншуем вас, дарагія сябры-беларусы, і вітаем вас на рускай зямлі.

Вечар адкрыла намеснік сакратара парткома пасёлка Т. Волгіна. Узнёсла і ўсхвалявана гаварыла яна пра Беларусь, прасіла перадаць мужнаму і працавітаму беларускаму народу самыя шчырыя вітанні і пажаданні працоўных Падмаскоўя. Аб дружбе і супольніцтве рускай і беларускай літаратур гаварыў на вечары пісьменнік М. Гарбачоў. Гарачымі апладысментамі сустрэла зала І. Мележа, які ад імя беларускай дэлегацыі вітаў жыхароў пасёлка.

А пасля гучалі беларускія вершы. Выступалі паэты Е. Лось, М. Калачынскі, Г. Бураўкін, Р. Барадулін, Э. Агняцвет, С. Грахоўскі, студэнты літінстытута Я. Крупенька, Р. Баравікова, Л. Філімонава, І. Ласкоў.

Дарагіх гасцей віталі дзяржынскія піянеры. І зноў у зале гучала беларуская мова — дзеці чыталі вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Уладзіміра Дубоўкі.

Гаспадары і госці абмяняліся памятнымі дарункамі. Дзяржынцы перадалі беларусам віншавальны адрас, а беларускія пісьменнікі — гаспадарам палаца — партрэт Янкі Купалы і сувенірнае выданне твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Вечар працягваўся ў фае Палаца культуры. Гасцей з Беларусі акружаюць жыхары пасёлка. Завязваюцца знаёмствы, размовы пра Беларусь, сяброўскія гутаркі. Беларускія пісьменнікі пакідаюць сваім дзяржынскім чытачам аўтографы...

І вось прыйшла пара развітання. Дні беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве закончыліся. Яны былі вялікім святам дружбы і братэрства. Напярэдадні юбілею БССР і КПБ яны паказалі масквічам, якіх выдатных поспехаў дамогся беларускі народ за гады Савецкай улады.

Варлен БЕЧЫК,
спец. карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва».

ІМ ПРЫСВОЕНЫ ГАНАРОВЫЯ ЗВАННІ

АНІКОВІЧ Усевалад Іванавіч, заслужаны дзеяч культуры БССР. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна, больш дзесяці гадоў працаваў інструктарам па культурна-масавай рабоце ў войсках ЧБВА. Удзельнік раду заключных канцэртаў усеармейскіх фестываляў самадзейнага мастацтва. З 1967 года працуе начальнікам Мінскага акруговага Дома афіцэраў.

АСВЯЦІНСКІ Геральд Балеслававіч, заслужаны дзеяч культуры БССР. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна. Ва ўстановах культуры працуе з 1960 года. З 1960 па 1965 год — намеснік начальніка і начальнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення культуры. З 1965 — дырэктар Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Якуба Коласа.

БЯЛЬЗАЦКАЯ Марына Мікалаеўна, заслужаны дзеяч культуры БССР. У 1931 годзе скончыла балетны тэхнікум пры Вялікім тэатры Саюза ССР. Да 1944 года працавала ў мюзік-холе і іншых тэатрах Масквы. Пасля вайны жыве і працуе ў Беларусі. З 1957 года — мастацкі кіраўнік дзіцячага самадзейнага танцавальнага калектыву «Раўсвенік» Мінскага палаца культуры прафсаюзаў. За выдатныя творчыя поспехі калектыву прысвоена ганаровае званне народнага.

ВІШКАРОЎ Барыс Якаўлевіч, заслужаны дзеяч культуры БССР. Скончыў тэатрэтудыю імя Шаляпіна ў Маскве, студыю Ярмолавай і эксперыментальныя тэатральныя майстэрні Дзяржаўнага камернага тэатра пад кіраўніцтвам А. Таірава. Працаваў у трупе тэатра, а потым у трупе Маскоўскага радыёкамітэта. З 1937 года — артыст Маскоўскага тэатра імя Ленсавета. Здымаўся ў кінафільмах «Суворaў» і «Прынц і жабрак». Пасля вайны працуе ў Беларусі — спачатку ў Дзяржаўным рускім драматычным тэатры, дзе ён сыграў больш 20 роляў, а з 1947 года — у тэатральна-мастацкім інстытуце.

ВЫСОЦКІ Канстанцін Таўрылавіч, заслужаны дзеяч культуры БССР. Вучыўся ў Ленінградскім бібліятэчным інстытуце імя Н. К. Крупскай. Працаваў начальнікам Мазырскага аддзела кінафікацыі, а з 1952 па 1963 год — загадчыкам Мазырскага і Даманавіцкага аддзелаў культуры. З 1963 года — дырэктар Мазырскага гарадзкога кінатэатра.

ПАДАРУНАК КАМПАЗІТАРА

Ленінскі музей у 62-й сярэдняй школе Мінска з'яўляецца гордасцю навучэнцаў і выкладчыкаў. Тут сабрана мноства экспанатаў, якія расказваюць наведвальнікам аб юнацкіх гадах, жыцці і рэвалюцыйнай дзейнасці Уладзіміра Ільіча. А нядаўна школьны музей папоўніўся яшчэ адным цікавым экспанатам. Гэта брашура кампазітара Дзмітрыя Кабалеўскага «Пра тое, як Ленін любіў музыку», якую аўтар разам з гукавым пісьмом даслаў вучням.

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

За заслугі ў галіне савецкай літаратуры і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР пісьменнік Кірэенка Канстанцін Ціханавіч узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

Марына БАРСТОК

У ВЯЛІКІМ ПАХОДЗЕ

СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ПАЭМЫ

Што выяўляе паэма? Па вядомым вызначэнні Бялінскага, найвышэйшыя моманты нацыянальнай гісторыі. Такім момантам у гісторыі нашай краіны была Кастрычніцкая рэвалюцыя. Натуральна, што Кастрычнік даў магутны штуршок развіццю паэмы ў шматнацыянальнай савецкай літаратуры.

Кастрычнік адкрыў новую старонку і ў гісторыі беларускай паэмы, якая адразу ж, у першыя рэвалюцыйныя гады, узяла на сябе задачу раскрыць эпічны змест эпохі, народжанай у полымі рашучых класавых боек, яе гарэнне, веліч і перспектывы.

Наўрад ці можна лічыць выпадковым, што першым буйным творам беларускай савецкай літаратуры была менавіта паэма і што іменна яна з найбольшай эмацыянальнай паўнатой перадала інтэнсіўнасць і вастрыню барацьбы паміж светам новым і старым, рашучасць рэвалюцыйнай атакі на ўсё аджытае і асуджанае.

Мы гаворым пра паэму «Босыя на вогнішчы» Міхася Чарота, пра паэму, якая і сёння хвалюе, бо ў ёй паказана рэвалюцыйнае дзеянне саміх мас на самым важным, крутым, драматычным павароце гісторыі.

У паэме Чарота, удзельніка і летапісца падзей, калектыўны герой выйшаў на арэну гісторыі, каб вырашыць галоўныя палітычныя, сацыяльныя і нацыянальныя канфлікты. Паэт далёкі ад таго, каб прыхарошваць, маляваць адно ружовымі фарбамі сваіх герояў-паўстанцаў. Ён добра бачыць і той элемент стыхійнасці, які не мог не пакінуць свайго следу ў руху мас, учарашніх «босых і голых», што ўзяліся руйнаваць і нішчыць стары свет. Але паэт бачыць і тое, як у працэсе змагання растуць паўстанцы, ён чуйна прыслухоўваецца да іх галасоў, калі яны мараць: там за пылам руйнавання і дымам пажару «мы на прадвечных руінах працы палац пабудуем».

«Босыя на вогнішчы» — апаленая агнём першая ластаўка беларускага паэтычнага эпасу аб рэвалюцыі. Паэма перадала круцізну гістарычнага павароту, адчуванне адыходу старога, пафас нараджэння ў цяжкасцях і пакутах новага, справядлівага свету. Усе наступныя паэмы Чарота па сутнасці выраслі з «Босых на вогнішчы», яны як бы разгортвалі магчымасці, закладзеныя ў першай паэме: «Чырванакрылы вяшчун» гаварыў пра тое, як, дзякуючы рэвалюцыі, шырачэзна развінуліся інтэрнацыянальныя далягляды беларускіх народных мас; «Беларусь лапцюжная» — пра тое, як робіцца непераможнай сілай саюз рабочага класа з працоўным сялянствам; «Ленін» — пра бясконцую любоў і адданасць народа свайму вялікаму правадыру і настаўніку.

Сёння, з адлегласці многіх дзесяцігоддзяў, можна знайсці нямала хібаў у паэмах М. Чарота. Але няможна перакрэсліць той бясспрэчны факт, што гэтыя паэмы былі не проста літаратурнымі з'явамі, — яны засведчылі працэс новага — савецкага — самавызначэння працоўных беларускіх мас, іх ідэйнага, духоўнага росту ў паслярэвалюцыйных умовах.

Беларуская паэма першых паслярэвалюцыйных год развівалася ў розных кірунках: калі Чарота вабілі перш за ўсё пафас карэннай ломкі старога, вастрыня разрыву з мінулым, то, наадварот, Купала ўбачыў у рэвалюцыі яе арганічную пераемнасць з усім лепшым, што на працягу стагоддзяў захавала народная маса ў сваёй паэтычнай памяці, і перш за ўсё ажыццяўленне мары народа аб уласнай дзяржаўнасці, аб вольнай працы на вольнай зямлі.

«Безназоўнае» Янкі Купалы — цудоўная, «разлеглая», поўная святла паэма-песня пра тое, як пад сцягам сацыялістычнай рэвалюцыі ажыццяўляецца ідэал народнай цэласнасці, як выпростваецца народ, ідучы насустрач сваёй будучыні. Галоўнае ў паэме — думка аб дыялектычнай і непарыўнай сувязі паміж эпохамі, пакаленнямі, паміж мінулым і наступным:

На продкаў плечах паўзрасталі вежы,
Дзе торг вялі за нас.
А мы патомкам нашым кінем межы
Без ашуканскіх крас.
Яшчэ пакінулі нам асляпленне,
Пашану да пакут.
А мы пакінем песню вызвалення
І вольны бацькаў кут.

(Заканчэнне на 3-й стар.).





Сталіца рыхтуецца да свята. Праз некаторы час рэзкі снежаньскі вецер запалошча чырвоныя палотнішчы. А сёння па вуліцах ездзяць машыны з люлькамі, высока ўзнятымі ўгару, — развешваюцца рознакаляровыя ліхтары і транспаранты. Маляры працягнулі гнуткія гумавыя шлангі сваіх краскапультаў аж пад самыя дахі шматпавярховых дамоў. На плошчах ідуць рэпетыцыі, у якіх ужо сёння можна ўбачыць рысы будучага велічнага парада. Сталіца рыхтуецца да свята...



Малюнкі мастака Ул. ПАШЧАСЦЕВА.

Фатаграфія нагадала...

ПАДАРОЖЖА Ў МАЛАДОСЦЬ

Гэтаму здымку амаль трыццаць пяць гадоў. Аднак паслужлівая памяць міжвольна ўзнаўляе «падзеі дзён даўно мінулых». Нібы машына часу пераносіць мяне ў самы пачатак трыццатых гадоў, адкуль пачаліся першыя крокі музычнага вяшчання Беларускага радыё. Гэта былі першыя крокі сімфанічнага аркестра — аднаго з музычных ансамбляў вялікага тады калектыву радыё, які аб'яднаў амаль усе мастацкія сілы тагачаснага Мінска ды, зрэшты, і ўсёй Беларусі.

Фатаграфія са знаёмымі тварамі людзей, з якімі прайшло тваё юнацтва, якія дапамаглі табе абраць жыццёвы шлях, ад якіх многаму навучыўся, якіх шчыра паважаў, з якімі моцна сябраваў доўгія-доўгія гады. Углядаюся, і сэрца сціскаецца ад таго, што амаль дзве трэці гэтых людзей ніколі ўжо не засмяюцца, не загавораць, не крануць струн сваіх інструментаў. Так! Вайна... Многіх нашых сяброў адабрала яна. Але мы, жывыя, помнім і іх творчы запал, і чулыя сэрцы, і талент...

Назаву некаторых з іх.

Вось у першым радзе, першы злева сядзіць «па-турэцку» Міхась Барчукоў, удзельнік грамадзянскай вайны, потым студэнт-музтэхнікума, артыст нашага аркестра. Толькі тыдзень не дажыў ён да дня Перамогі, загінуўшы пад Берлінам у званні падпалкоўніка.

Трэці, што сядзіць, абхапіўшы рукамі калені, Абрам Панэс, таленавіты скрыпач, салдат, якога жонка і сын так і не дачакаліся з Айчыннай вайны. Такі ж лёс напаткаў і цудоўнага віяланчэліста Грышу Буданіцкага (восьмы ў першым радзе). А побач—Міша Рыўкін — цяпер галоўны дырыжор Томскага сімфанічнага аркестра і Пятро Наркуцкі—саліст аркестра і выкладчык адэскай кансерваторыі.

У сярэдзіне другога рада, у светлым касцюме — Ісак Любан, кампазітар і галоўны рэдактар музычнага вяшчання. Сівы паважаны чалавек, што сядзіць побач з ім — былы шэф нашага аркестра, славуты савецкі дырыжор, прафесар Леў Пятровіч Штэйнберг. Гэта яму наш аркестр быў абавязаны сапраўдным прафесіяналізмам, творчым натхненнем ды і ўсім лепшым, чым звычайна вылучаецца добры мастацкі калектыў. Справа ад яго—былы старшыня радыёкамітэта Аракелаў. Побач—скрыпач і музыказнаўца Юліян Мікалаевіч Дрэйзін. Ён дасканала ведаў адзінаццаць моў, перакладаў на беларускую непасрэдна з арыгіналаў італьянскія, французскія і нямецкія оперныя лібрэта. Яго ўсхваляваныя гутаркі перад мікрафонам былі палымянымі выступленнямі прапагандыста беларускай музыкі.

Чатырнаццаты ў другім радзе—саліст Беларускага радыё спявак Міхась Лоткер, а трэці справа—выкладчык кансерваторыі і артыст нашага аркестра, літаўрыст Сцяпан Сцяпанавіч Маркоўскі. Чалавек няўрымслівы, эмацыянальны, улюбёны ў людзей, ён усю вайну правёў у партызанах, удзельнічаў у многіх баях і быў такім удалым агітатарам, што, па расказах сяброў, распрапагандаваў цэлы варожы гарнізон, які пасля гэтага перайшоў да партызан.

Трэці рад... Пяць першых музыкантаў загінулі ў час вайны. Шосты—Самуіл Львовіч Ратнер, скрыпач нашага аркестра, потым дырыжор, выкладчык кансерваторыі. Ён многа працаваў на радыё, вельмі ўдала аформіў музыкай дзесяткі радыёпастановак. Цяпер цалкам аддаўся педагагічнай рабоце.

Дзевятым стаіць трубач Сяргей Кулага, які першы з беларускіх аркестрантаў быў узнагароджаны ў 1940 годзе ордэнам «Знак Пашаны». Амаль тры дзесяткі гадоў аддаў ён рабоце ў Беларускім дзяржаўным тэатры оперы і балета, а цяпер працуе на літаратурна-музычным факультэце педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Побач—Мікола Крук, цяпер канцэртмайстар групы ў Дзяржаўным сімфанічным аркестры БССР.

Праз аднаго стаяць былыя выкладчыкі кансерваторыі і артысты нашага аркестра дацэнт Ян Осіпавіч Сцягенны і прафесар Канстанцін Георгіевіч Папавіцкі. Наступны — віяланчэліст Абрам Шапіра: шмат гадоў ён быў артыстам Вялікага сімфанічнага аркестра Усесаюзнага радыё. Цяпер зноў вярнуўся ў родныя мясціны і працуе ў Дзяржаркестры БССР.

Апошні ў гэтым радзе—былы канцэртмайстар нашага аркестра вучань славутага Аўэра, цудоўны скрыпач і надзвычай вясёлы дасціпны чалавек Кравец.

А вось і чацвёрты рад. Пятым стаіць хлопец з Фаніполі, кантрабасіст Валодзя Хаменка Зараз ён канцэртмайстар групы Вялікага сімфанічнага аркестра Усесаюзнага радыё і прафесар інстытута імя Гнесіных. Побач таксама беларускі вясковы хлопец Міхась Станкевіч—з 1939 года першая валторна Украінскага дзяржаўнага аркестра, а наступны, з тугою грыўкаю на лобе, тубіст Вася Карлаў. Яго нам прыслалі на перавыхаванне прама... з турмы. Былы «дамушнік» выявіў незвычайныя здольнасці да музыкі, яму паверылі і накіравалі да нас. І Вася сапраўды стаў сумленным чалавекам, добрым таварышам і цудоўным музыкантам. І адзінае, што засталося ад яго ранейшай «спецыяльнасці», была татуіроўка, якая пакрывала літаральна кожны квадратны сантыметр Васевай скуры і вылезла нават на лоб (у гэтым і «сакрэт» грыўкі).

Трэці за Васем—Аляксей Еўлампіевіч Туранкоў. У той час ён яшчэ не меў кампазітарскай славы і быў сціплым альцістам у нашым калектыве. Дванаццаты — Міця Кузаўлёў, былы чырвонаармеец-будзёнавец, штаб-трубач палкоўніка Г. К. Жукава, калі апошні камандаваў кавалерыйскім палком у Мінску. Дарэчы, менавіта Жукаў накіраваў Міцю ў музтэхнікум, адкуль ужо дарога прывяла яго да нас у аркестр. Ну, а хто захоча пагутарыць з Дзмітрыем Андрэевічам Кузаўлёвым цяпер, можа зайсці ў Саюз кампазітараў Беларусі, дзе працуе былы будзёнавец.

Хлопец у апошнім радзе ў клятчастай кашулі—аўтар гэтых радкоў. Павінен сказаць, што праз нейкі час пасля таго, як быў зроблены гэты здымак, падышла мая чарга атрымаць талон на набыццё ў магазіне касцюма, і на другіх фатаграфіях я ўжо больш «салідны». Поруч, у паліто, стаіць мой выхавалець, прафесар кансерваторыі і канцэртмайстар групы нашага аркестра Ігнацій Рыгоравіч Салодчанка. Усю вайну ён быў сувязным партызанскага атрада.

Цяпер, нібы пераняўшы эстафету ад бацькі, у аркестры Беларускага радыё і тэлебачання намеснікам канцэртмайстра працуе дачка Ігнація Рыгоравіча Аня Рудніцкая, і гэта ўжо новае пакаленне, якое прадоўжыць справу, што пачыналі многа гадоў назад і тыя, каго вы бачыце на гэтай старой фатаграфіі.

Дзмітрый ЖУРАЎЛЁЎ.

ЗАЛАТАЯ ВОСЕНЬ МАЙСТРА

НАРОДНАМУ АРТЫСТУ СССР Я. ЦІКОЦКАМУ — 75 ГАДОЎ



Яўгену Карлавічу Цікоцкаму 26 снежня спаўняецца семдзесят пяць гадоў. З іх ён паўстагоддзя аддаў творчасці.

Безумоўна, такі шлях у мастацтве ўжо сам па сабе не можа не выклікаць павагі і ўдзячнасці ўсіх, хто разумее, колькі сіл і натхнення трэба ахвяраваць, каб прайсці яго і здзейсніць задумы. Але яшчэ большага захаплення і шанавання заслугоўвае тая мэтанакіраванасць, вернасць абранай тэме, што характэрна для творчасці юбіляра. І я не памылюся, калі скажу, што Я. Цікоцкі стварыў своеасаблівы музычны летапіс эпохі, што ніводная хвалюючая падзея не абыдзена яго ўвагай, не засталася без творчага асэнсавання і ўвасаблення ў музыцы розных жанраў.

Кампазітар Я. Цікоцкі вельмі канкрэтна раскрывае ў музыцы аўтарскія адносіны да таго, што захапляе ці абурае чалавека. Ці не таму яго інструментальная музыка, — нават калі яна не мае пэўнай літаратурнай праграмы, заўсёды ўспрымаецца з вобразнай канкрэтнасцю, якая дае права гаварыць пра яснасць філасофскай, абагульненай праграмы твора, пра яснасць аўтарскай канцэпцыі і выдатнае адчуванне музыкі, яе ўнутранай дынамікі.

І яшчэ адна думка пра спецыфіку творчасці Я. Цікоцкага і асаблівасць шляху кампазітара ў мастацтве. Ён не назірае «збоку» за тымі падзеямі, якія ўвасабляе ў музыцы, а жыве ў самой іх гушчыні.

Не буду галаслоўным. У пачатку гэтага месяца на юбілейным пленуме Саюза кампазітараў БССР, прысвечаным пяцідзесяцігоддзю рэспублікі і Кампартыі Беларусі, грамадскасць Мінска з вялікім задавальненнем слухала вакальна-сімфанічную паэму Я. Цікоцкага «Песня пра Буравесніка» на словы М. Горкага. Гэта першы буйны твор на жыццёвым шляху кампазітара, і ён вытрымаў выпрабаванне часам. Пачынаў працу над гэтым творам у рэвалюцыйным Петраградзе ўдзельнік першай сусветнай вайны Я. Цікоцкі. А закончыў паэму ўжо чырвоны камандзір Я. Цікоцкі ў дні грамадзянскай вайны ў франтавым Бабруйску, дзе ён абараняў заваёвы той рэвалюцыі, пра якую расказвала яго музыка.

Пойдзем далей па этапах творчага жыцця кампазітара, па буйнейшых старонках яго музычнага летапісу. Першая, Другая і Трэцяя сімфоніі—тры аповесці пра родную Беларусь. Так, гэта не памылка: для пецярбуржца па нараджэнні, Яўгена Карлавіча Цікоцкага, Беларусь — самы родны кут нашай краіны, яму ён прысвяціў усе свае песні і думы. Кожная сімфонія ўвасабляе адказнейшыя падзеі ў жыцці рэспублікі — грамадзянскую вайну, уз'яднанне ў верасні 1939 года беларускіх зямель у адзінай Савецкай сацыялістычнай дзяржаве, векапомныя дні Вялікай Айчыннай вайны. І ўсе тры сімфоніі нацыянальныя не толькі па змесце, па «сюжэце», але і па сродках музычнага выяўлення, на багацці выкарыстання народнага меласу. І ўсе тры сімфоніі —не назіранні, а музычнае асэнсаванне тых падзей у жыцці народа, удзельнікам якіх аўтар быў сам.

А ці мог Я. Цікоцкі— мастак-гуманіст, чалавек, які бачыў жахі трох войнаў, які сваю грамадскую дзейнасць прысвяціў барацьбе супраць падпальшчыкаў новай вайны, — ці мог ён не напісаць сваю Чацвёртую сімфонію—роздум пра мір на зямлі, пра шчасце людзей.

У Пятай і Шостай сімфоніях мастак імкнецца расказаць пра стваральную працу, гуманізм, жыццесцвярджальнасць сваіх сучаснікаў — будаўнікоў камуністычнага грамадства. І тут ён імкнецца да канкрэтызацыі падзей, да шырокага выкарыстання інтанацый беларускіх народных, а таксама рэвалюцыйных песень. Гаворачы пра сімфанічную творчасць Я. Цікоцкага, нельга не назваць і яго паэмы «Свята на Палессі», «Слава», «50 гадоў», якія сведчаць аб творчай аператыўнасці аўтара, яго ўменні хутка і натхнёна адгукацца на падзеі жыцця.

З яшчэ большай сілай выявіліся гэтыя якасці майстэрства Я. Цікоцкага ў яго опернай творчасці. Калі Першая сімфонія кампазітара была першым у беларускай музыцы творам такога жанру на рэвалюцыйную тэматыку, дык і опера «Міхась Падгорны» — першынец нацыянальнай оперы на сучасную тэму. Скажам больш, опера Я. Цікоцкага «Міхась Падгорны», як і Ц. Хрэннікава «У буру», належыць да першых савецкіх опер, у якой аўтар зрабіў спробу расказаць пра У. І. Леніна.

Слова «першы» трэба далучыць да прозвішча Я. Цікоцкага і калі гаворка ідзе пра яго оперу «Алеся», бо менавіта Яўген Карлавіч — першы савецкі кампазітар — стваральнік оперы пра ўсенародную партызанскую барацьбу супраць фашысцкіх захопнікаў. Ён пісаў гэты твор у суровыя ваенныя дні, пад агнём фашысцкіх гармат у часцях дзеючай арміі, куды выязджаў для сустрэч з воінамі. Часам можна пачуць папрок, што «Алеся» мела некалькі сцэнічных рэдакцый, што кожны раз аўтар дапісваў або часткова змяняў музыку. А чаго ж папракаць аўтара: ці трэба спыняць пошук таго, як найбольш дакладна перадаць самыя гераічныя старонкі шэсця ў неўміручасць цэлага народа.

Дзесяткі твораў: араторыі і інструментальныя канцэрты, камерныя ансамблі і хоры, рамансы і песні, музыка для кіно і тэатра...

Сярод іх ёсць больш і менш удалыя, тыя, што вядомы толькі музыказнаўцам, і такія, якім суджана доўгае жыццё і палкая ўдзячнасць сучаснікаў і нашчадкаў. Тыя, хто ведаюць Я. Цікоцкага-мастака, маюць права сцвярджаць, што кожны свой твор ён пісаў з вялікім захапленнем, з любоўю да людзей, з жаданнем, каб музыка была ім падмогай.

Так, Яўген Карлавіч ніколі не адмаўляўся ад творчага заказу, заўсёды аператыўна пісаў на тэму дня. У аператыўнай «хватцы» кампазітара часткова крыецца і здзіўляючая, зусім маладая па энергіі творчая актыўнасць юбіляра. У 75 гадоў мець у творчым партфелі новыя оперу, сімфанічную паэму, фартэпіянную санату і цыкл рамансаў можа толькі нястомны вельмі яркі творца.

Добрага здароўя і багатага творчага плёну вам, дарагі Яўген Карлавіч!

І. НІСНЕВІЧ.

СВЯТОЧНЫЯ АФІШЫ

Народныя тэатры і драматычныя калектывы Брэсцкай вобласці рыхтуюць да 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі святочныя прэм'еры.

Калектыў народнага тэатра Баранавіцкага гарадскога Дома культуры спыніў сваю ўвагу на камедыі К. Крапівы «Хто смяецца апошнім». Ставіць гэты спектакль рэжысёр тэатра В. Волкаў. Работа над яго пастаноўкай ужо завершана. Хутка — прэм'ера.

Амаль кожны вечар збіраюцца на рэпетыцыі артысты народнага тэатра Целяханскага Дома культуры. Яны рыхтуюць да юбілею рэспублікі спектакль па п'есе П. Васілёўскага «Год 1917» (рэжысёр Л. Уліціна). Ім актыўна памагае заслужаны артыст рэспублікі А. Самараў.

Старэйшы ў вобласці драматычны калектыў Іванаўскага раённага Дома культуры адзначыць юбілей рэспублікі пастаноўкай п'есы К. Губарэвіча «Першы ўрок» (рэжысёр С. Лазюк, кансультант — рэжысёр Брэсцкага тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі Р. Баравік).

ТАМ, дзе Ільіч вучыўся

Сяброўскія сувязі ўстанавіліся паміж студэнтамі Беларускага і Казанскага універсітэтаў. Абедзве гэтыя буйнейшыя навучальныя ўстановы краіны носяць імя вялікага Леніна.

У Казані, там, дзе вучыўся Ільіч, пабывала група студэнтаў БДУ—актыўных удзельнікаў мастацкай самадзейнасці. Сярод іх — танцавальны калектыў, універсітэцкі аркестр народных інструментаў, лаўрэат Усесаюзнага конкурсу чытальнікаў, студэнтка трэцяга курса факультэта журналістыкі Святлана Дубоўская і іншыя. Беларускія госці наведалі месцы, звязаныя з юнацкімі гадамі і вучобай Уладзіміра Ільіча Леніна, далі некалькі канцэртаў для студэнтаў і працоўных Казані.

І. ЛЯСКОЎСКІ.

КІНО

ФІЛЬМ ПРЫДУМАЛІ ДЗЕЦІ

Дзеці... Пакуль яны яшчэ з цяжкасцю адчыняюць вялікія дубовыя дзверы музея. Многія з іх яшчэ не ўмеюць нават чытаць. Але паглядзіце на іх твары, іх вочы. З якой прагай і цікаўнасцю глядзяць яны на ўсё, як хочуць усё ўведаць і зразумець... Вось гэты хлопчык, які нечым захапіўся. Пацікаўцеся, запытайце яго, напрыклад, які эфес шаблі Чапаева? І ён вам раскажа. Падрабязна і з захапленнем. І намалюе. Яму дапаможа ўяўленне, смелая фантазія...

Сур'ёзныя, гарэзлівыя, дапытлівыя вочы дзяцей. Так пачынаецца кароткаметражны дакументальны фільм «Летапіс», які, як сказана ў цітрах, прыдумалі ўдзельнікі беларускай рэспубліканскай выстаўкі дзіцячага малюнка.

На экране — намаляваны малышом цар. Царыца. Буржуй. Карабель. Спачатку проста карабель, чорна-сіні. А потым — «Аўрора» з чырвоным, палаючым на ўвесь малюнак флагам...

Колер у малюнках актыўны. Чырвонае — рэвалюцыя. Чырвонае перамагае чорнае.

Рабочыя ў чырвонаармейскіх будзёнаўках будуюць дом. Яны ж скачуць на конях з вінтоўкамі, шашкамі... «За ўладу Саветаў!» І раптам — анархіст. У яго не толькі перакошаны твар. Ён увесь бязладна распісаны палоскамі-патранташамі. Дзе дзеці бачылі такога анархіста? Ну, вядома ж, гэта домысел, уяўленне пра тое што расказвалі дарослыя, кінафільмы, тэатральныя пастаноўкі... Маленькі мастак стварае свой вобраз. Абагулены.

Дзеці ўсё ўспрымаюць вобразна. Ярка. Характарыстыкі іх заўсёды дакладныя, лаканічныя. Яны не толькі расказваюць, яны выказваюць свае адносіны да таго, аб чым гавораць. Буржуй, у якога маленькія заплыўшыя вочы, раздзьмутая на ўвесь ліст фізіяномія, сядзіць на шыі рабочага.

Матрос. Зорка. Чырвоная пяціканцовая зорка, намаляваная рукой шасцігадовага хлопчыка, займае ўвесь экран. Узяты Зімні! Чырвоная крамлёўская сцяна. Палыхаюць сцягі. І потым над светам цішыня... Поле селяніна. Зямля. Мірная будоўля. Заводы.

І раптам зноў на экран урываецца трывога. Дзеці малююць вайну: танкі, кулямёты, самалёты. Перакошаныя твары людзей. Чорныя — фашысты. Чырвоныя — савецкія салдаты. І вось чырвонае перамагае. На малюнках чырвоныя сцягі. Ура! Слава! Перамога!

Фільм прыдумалі дзеці... Але колькі ў гэтай прыдумцы праўды! За дзесяць мінут перад гледачом праходзіць паўвекавая гісторыя. Вачыма дзяцей мы нібы пагарталі старонкі мінулага. І разам з імі, захопленыя іх непасрэднасцю, эмацыянальна ад гукнуліся на перажытае народам, краінай...

Вялізнае чырвонае сонца плыве над зямлёй. Яно сёння галоўнае ў малюнках дзяцей. Таму што без яго не будзе залаціцца збожжа на палях, не будуць красавацца велічныя дамы на вуліцах. Не будзе ў руках гэтых людзей пышных, надзвычайна яркіх букетаў...

У фільме няма ніякіх слоў, няма надпісаў, няма аўтарскага тэксту. Асноўныя акцэнты расстаўлены вобразнымі выяўленчымі сродкамі. Ты разам з маленькім мастаком то з'едліва смяешся, то абураешся, то захапляешся чалавекам, які працуе, то паўтараеш гнеўнае: «Далоў, далоў фашыстаў! Няхай заўжды будзе сонца! Няхай жыве мір!»

...На фоне спакойнага неба лунае закінутая высока ўгору папяровая чайка. Хлопчык сочыць за яе палётам. Як яна падобна на сапраўдную белакрылую, якая тут жа ўзлятае ўвышыню... Узлятае ўвышыню, у космас, ракета... Шырокая, спакойная мелодыя плыве над зямлёй.

Гэтымі кадрамі заканчваецца кінастужка «Летапіс». І хоць усё так спакойна ў апошніх кадрах фільма, ты пакідаеш залу з нейкай трывогай — як зберагчы гэты спакой? Гэту радасць, якая акружае цябе і тваіх дзяцей? Ці не пра гэта таксама хацелі сказаць аўтары стужкі, захапляючыся дзіцячай творчасцю?

Глыбокі, змястоўны і пасапраўднаму сур'ёзны фільм «прыдумалі» нашы дзеці. А паставіў яго рэжысёр Ігар Калоўскі, зняў аператар Пётр Шумскі па сцэнарыі Алены Астроўскай, музыку для фільма напісаў Яўген Грышман.

Браніслава ЛОБАН.

НАБЫТКІ КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ

Сёлетні год для Мінскага абласнога краязнаўчага музея багаты на звычайныя і незвычайныя набыткі. Экспанатам, да якога яшчэ «не прывыклі» нават супрацоўнікі музея, з'яўляецца залататканы слуцкі пояс даўжынёю каля трох метраў, шырынёю—«на локаць». У ражку пояса стаіць назва «Слуцк». Пояс упрыгожаны «цвятком радзімым васілька». Нягледзячы на свой больш чым паважаны «ўзрост», пояс і сёння не страціў хараства.

Перадаў нашаму музею гэты дарагі экспанат Маскоўскі гістарычны музей.

Жудасны напамінак вайны— рэшткі абпаленага посуду, хатні рыштунак і іншыя рэчы паступілі з месца ўзвядзення мемарыяльнага комплексу ў былой вёсцы Хатынь. Гэтыя экспанаты будуць моцна ўражваць і хваляваць кожнага наведвальніка нашага музея, напамінаць аб тых, хто загінуў у дні Вялікай Айчыннай вайны.

Прыдбалі мы яшчэ нямала іншых каштоўных экспанатаў. Сястра старэйшага бальшавіка Івана Адамавіча Міхалёнка — былога старшыні Маладзечанскага валаснога рэўкома ў 1919 годзе, якая жыве цяпер у Маскве, перадала музею некалькі важных матэрыялаў. Сярод іх дыплом аб заканчэнні Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі і два дакументы аб заканчэнні І. Міхалёнкам двух факультэтаў Ваеннай акадэміі імя М. В. Фрунзе. Маем мы цяпер узнагародны ліст, у якім гаворыцца аб тым, што наш зямляк быў узнагароджаны асабістай зброяй — пісталетам сістэмы «маўзер».

Цікавасць уяўляюць даўнейшыя карты са Стара-Барысава, па якіх бачна, як размяркоўвалася зямля паміж сялянамі і памешчыкамі.

Жонка Браніслава Тарашкевіча—былога старшыні Беларускай сялянска-работніцкай грамады падарыла музею некаторыя яго асабістыя рэчы.

За апошні час мы атрымалі шмат археалагічных матэрыялаў з Лагойска. Іх здаў музею навуковы супрацоўнік Акадэміі навук БССР М. Чарняўскі.

Сёлета ў наш музей паступіла больш 800 новых экспанатаў.

Г. КАХАНОЎСКІ,
старшы навуковы супрацоўнік Мінскага абласнога краязнаўчага музея.

РУКАМІ НАРОДНЫХ УМЕЛЬЦАЎ

Жыве ў Жлобіне разьбяр па дрэве Міхаіл Абрамавіч Івінскі. Зараз ён працуе над скульптурнай кампазіцыяй «Заўсёды з народам». Гэта фігуры рабочага і матроса, якія з захапленнем слухаюць Ільіча.

Маляр швейнай фабрыкі Фёдар Юльевіч Бузоўскі таксама скульптар-аматар. За тры апошнія гады ён стварыў сваю Ленініяну — «Ленін у Крамлі», «Ленін — правадыр», «Ленін на трыбуне». Скульптару-аматару належаць яшчэ дзве работы з вобразам Ільіча. Вялікі бюст Леніна ўстаноўлены перад фабрыкай, а двухметровая скульптура—у швейным цэху прадпрыемства. Нядаўна Фёдар Юльевіч завяршыў работу над бюстам Ільіча для падшэфнага калгаса «Іскра».

М. ЯНЧАНКА.

50 Экскурсійнае бюро ЛіМа

ШТАБ БЕЛАРУСКАЙ НАВУКІ

А. МАЖЭЙКА,
навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР.

Ленінскі праспект, 66. Манументальны, чатырохпавярховы будынак. Па фасадзе яго — каланада, якая паўколам сцягвае крылы гмаха, замыкаючы іх у адзіным архітэктурным ансамблі. Гэта — галоўны корпус Акадэміі навук БССР, узведзены па праекце І. Р. Лангбарда ў 1936—1939 гг.

Па абодва бакі раскінутых крылаў галоўнага корпуса — будынкі інстытутаў, бібліятэкі, выдавецтва...

У складзе Акадэміі навук — 19 навукова-даследчых інстытутаў, 9 самастойных аддзелаў і лабараторый, эксперыментальны завод. Ва ўсіх гэтых установах працуе каля чатырох тысяч чалавек. Сярод іх 59 акадэмікаў, 37 членаў-карэспандэнтаў, 72 дактары і больш як 600 кандыдатаў навук.

Успомнім, дарэчы, што да рэвалюцыі ў Беларусі з кожных дзесяці чалавек восем былі непісьменныя. Не было ў нас ніводнай вышэйшай навучальнай установы, ніводнага даследчага інстытута. Хіба што тры дробныя доследныя станцыі: Мінская балотная, Беняконская сельскагаспадарчая і лекавых раслін пад Магілёвам.

Пытанне аб арганізацыі навуковага цэнтра рэспублікі было пастаўлена Камуністычнай партыяй і ўрадам БССР адразу ж пасля грамадзянскай вайны. Сход работнікаў культуры БССР 27 студзеня 1921 года прыняў пастанову аб заснаванні Інстытута беларускай культуры.

13 кастрычніка 1928 года ЦВК і СНК БССР прынялі пастанову аб рэарганізацыі Інбелкульта ў Беларускую Акадэмію навук, і 1 студзеня 1929 года адбылося ўрачыстае яе адкрыццё.

Падзея гэта была сапраўдным святам. Буйнейшыя дзеячы культуры і навукі Янка Купала, Якуб Колас, Змітрок Бядуля, У. І. Пічэта, Б. І. Эпімах-Шыпіла віншавалі акадэмію як «пуцяводную зорку ўсяго беларускага народа».

Званне акадэмікаў Беларускай АН было прысвоена буйнейшым дзеячам навукі і культуры краіны: выдатнаму геолагу А. П. Карпінскаму, вядомаму глебазнаўцу і аграному В. Р. Вільямсу, мовазнаўцу М. Я. Мару, гісторыкам М. М. Пакроўскаму і У. І. Пічэту. Ганаровымі акадэмікамі сталі М. Горкі і В. К. Бялыніцкі-Біруля. З гонарам насілі званне акадэмікаў Янка Купала і Якуб Колас, Цішка Гартны і Браніслаў Тарашкевіч, І. І. Замоцін, С. Я. Вальфсон і іншыя.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны акадэмія непазнавальна вырасла. Вучоныя зараз аб'яднаны ў пяці аддзяленнях: фізіка-матэматычным, фізіка-тэхнічным, хімічным, біялагічным і грамадскіх навук. Вырас яе аўтарытэт. Варта нагадаць хаця б такія факты.

Акадэмік Л. В. Лыкаў з'яўляецца рэдактарам ад СССР міжнароднага часопіса «Цепла- і масаабмен», які выдаецца ў Лондане. Акадэмік К. І. Лукашоў — кіраўнік адной з секцый Міжнароднай асацыяцыі па вывучэнні чацвярцічнага перыяду. Акадэмік Г. В. Багамолаў — віцэ-прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі гідрагеолагаў.

А цяпер давайце зробім экскурсію па інстытутах і лабараторыях нашага храма навукі.

Пачнём з галоўнага корпуса. Тут усе інстытуты аддзялення грамадскіх навук.

На другім паверсе — Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, якім кіруе акадэмік П. Ф. Глебка (частка сектараў размешчана і на чацвёртым паверсе). Дыяпазон навуковых спецыяльнасцей тут даволі шырокі. Тэатразнаўцы выдалі шэраг прац, якія паказваюць гістарычны шлях беларускага тэатра. Кіназнаўцы завяршылі работу над двухтомнай «Гісторыяй кіно БССР» і зборнікам «Сучаснае беларускае кіно». Ладавыя, рытмічныя і меладычныя асновы беларускай народнай музыкі, шлях нацыянальнай оперы і балета — гэта кола інтарэсаў сектара гісторыі музыкі, дзе нядаўна завершана калектыўная работа над летапісам музычнай культуры Беларусі з 1917 па 1965 г. Да юбілею рэспублікі сектар выяўленчага мастацтва падрыхтаваў некалькі даследаванняў, якія будуць выдавацца не толькі ў Беларусі, але і ў Маскве. Этнографы працуюць над шырокай праблемай — «Быт беларусаў». Кнігу-альбом «Слуцкія паясы» і выданні гісторыі беларускай этнаграфіі чытачы ўжо добра ведаюць. Нядаўна выйшла манаграфія М. Я. Грынблата «Беларусы». Фалькларысты нястомна збіраюць, запісваюць і даследуюць узоры народнай творчасці як дарэвалюцыйнага, так і савецкага часу. Год назад выйшла манаграфія «Беларуская народная вусна-паэтычная творчасць», а зараз пачата работа над шматтомным выданнем збору твораў нашага фальклору. Песні, частушкі, казкі, легенды, паданні, прымаўкі, анекдоты будуць сабраны ў 25 тамах. Першыя пяць тамоў падрыхтаваны да друку.

На трэцім паверсе завітаем да гісторыкаў. Яны правялі цікавыя даследаванні па гісторыі рэвалюцыйнага руху, сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва, партызанскай барацьбы ў гады Вялікай Айчыннай вайны, дзейнасці калгасаў і саўгасаў рэспублікі.

Распачата выданне пяцітомнай гісторыі Беларусі. Тры тамы будуць прысвечаны гісторыі беларускага народа ў савецкі час. Двума выданнямі выйшла «Гісторыя Мінска». Атрымала прызнанне калектыўная праца «Перамога Савецкай улады ў Беларусі».

Асобна трэба сказаць аб нястомнай, карпатлівай працы археолагаў. Улетку яны выязджаюць на раскопкі старажытных паселішчаў і замкаў у Полацк, Тураў, Заслаўе, Лукомль, Віцебск. Археалагічныя зборы і калекцыі Інстытута гісторыі заўсёды вабяць цікаўных. Гэтым летам археолагу Георгію Штыхаву пашанцавала знайсці скарб з арабскіх манет X стагоддзя, набор сярэбраных аздоб старажытнай крывічанкі, каменны абразок XII стагоддзя і іншыя, не менш важныя рэчы, якія добра сведчаць аб высокай духоўнай і матэрыяльнай культуры нашых продкаў.

На гэтым жа паверсе — Інстытут філасофіі і права. Сёлета тут створана некалькі калектыўных прац. Гэта «Нарысы гісторыі марксісцка-ленінскай філасофіі ў Беларусі» і «Органы дзяржаўнага кіравання БССР». Гэтак жа, як гісторыкі, многа часу і ўвагі філосафы і юрысты аддаюць прапагандысцкай і навукова-папулярызатарскай рабоце.

На чацвёртым, апошнім паверсе, завітаем спачатку да эканамістаў. Інстытут эканомікі, дырэктар якога—член-карэспандэнт АН БССР Ф. С. Марцінкевіч, скіроўвае сваю ўвагу на даследаванне тэхнічнага прагрэсу і эканамічных метадаў выкарыстання асноўных вытворчых фондаў, эфектыўнасці новай сістэмы планавання і эканамічнага стымулявання ў прамысловасці. Выпрацоўваюцца навуковыя рэкамендацыі па ажыццяўленні новых

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У першай палове 20-х гадоў Якуб Колас завяршыў задуманыя яшчэ да рэвалюцыі класічныя паэмы «Новая зямля» і «Сымон-музыка», якія сталі вяршыняй беларускага паэтычнага эпасу. Непасрэдна не звязаныя з тэмай рэвалюцыйных пераўтварэнняў, гэтыя паэмы, тым не менш, далі адчуць тыя маральныя рэсурсы народнай душы, тую народную прагу свабоды і справядлівасці, якім рэвалюцыя дала выйсце, на якія яна абапіралася, робячы святую і гуманную справу вызвалення ўсіх, «хто з голаду век пух».

Усёй сваёй сутнасцю звернутая да сучаснасці, да падзей рэвалюцыі, грамадзянскай вайны і будаўніцтва новых форм жыцця ў беларускай вёсцы, наша паэма 20-х гадоў не пакідала без увагі і ўласна гістарычную тэму. Больш таго, перамога народа ў барацьбе супраць сваіх прыгнятальнікаў, радаснае ўсведамленне народам небывалых жыццёвых прастораў, адкрытых Кастрычнікам, прымусілі нашых паэтаў па-новаму пільна і ўважліва прыглядзецца да шматвяковых традыцый народнага змагання за свабоду, за шчасце.

Гістарычная хроніка Ул. Дубоўкі «Крычаўская спакуса» ўзнаўляе яркі і трагічны эпізод вызваленчай барацьбы ў Беларусі ў сярэдзіне XVIII стагоддзя. Паўстанец Крычаў — сімвал краіны, якую не раз нішчылі ворагі, але якая зноў і зноў паўставала з попелу. Паўстанец Крычаў — гэта

У ВЯЛІКІМ ПАХОДЗЕ

адначасова і зусім рэалістычнае ўвасабленне канкрэтнай падзеі: у паэме Дубоўкі расказваецца пра тое, як працоўныя масы Крычава пад кіраўніцтвам Ветра, Карпача і Вашчылы ўзняліся на князёў Радзівілаў. Косы і сякеры, гаворыць паэт, біліся з гарматамі, і перавага была за сякерамі, бо яны стаялі за праўду. Чатыры гады Крычаў жыў свабодна, без паноў і прыганятых.

Князь Радзівіл не вылазіць з Варшавы:
ходзіць да круля, да яснавяльможных.
Просіць на крычаўскіх хлопаў управу,
далей марудзіць, ён кажа, няможна.
Гэта ж — спакуса для цэлага свету,
гэта ж — спакуса для іншых народаў...

Конніца і гарматы скрышылі сілу паўстанцаў, у страшных пакутах загінулі Карпач і Вецер, але «спакуса» жыве, «спакуса ў агні не згарае», бо

Гэта ж народ узнімаўся навалай,
а не Карпач, не Вашчыла ці Вецер,
Гэта ж народная сіла ўставала,
вечна яна існавацьме на свеце...

Надзвычай цікавая з'ява беларускай паэзіі 20-х гадоў — паэмы Паўлюка Труса. «Гэты тонкі лірык, — пісаў пра Труса Кузьма Чорны, — быў у той жа час і сапраўдным эпікам, і вельмі часта ў адным і тым жа творы гэтыя дзве плыні зліваліся ў адно музычнае гучанне».

Адзначаная Чорным асаблівасць Трусавага таленту найбольш ярка праявілася ў паэме «Дзесяты падмурак», дзе тэма новай, маладой Беларусі, яе будучыні гучыць «асабіста», задушэўна-лірычна і песенна. Выказаная ў гэтай паэме сардэчная мара аб заўтрашнім дні рэспублікі, калі яна «стане краем фабрык дымных і машын», стала паролем часу, лозунгам тых, хто ўзводзіў Асінбуд, хто асушваў палескія балоты, хто выводзіў у калгаснае поле першыя трактары.

Сапраўдным гімнам самаадданай і гераічнай практыцы калектыву, што перамагае адсталасць, дрыгву, нявер'е, «каб вольна, згодна, без прынук з балота йсці да яснаты», прагучэла ў свой час паэма Янкі Купалы «Над ракой Арэсай». З радкоў паэмы вырастае абагульнены, велічны вобраз камунарскай сям'і на чале з камуністам Модзіным. Паэма дасягае высокага трагічнага пафасу там, дзе паэт гаворыць пра ахвяры, пра тых, хто загінуў, штурмуючы ўчэпістую, гнілую багну мінулага:

Спі, наш Барысенка,
Камунарскі сыні..
Спі, наш Барысенка,
Лёгкім будзь пясок!..
Па табе застаўся
Твой малы сынок...

Пачынаючы, прыкладна, з сярэдзіны 30-х гадоў, беларуская паэма ўсё больш і больш акцэнтуе сваю ўвагу на тых фактах і з'явах новай, пераважна калгаснай, рэчаіснасці, на якіх можна было раскрыць думку аб канчатковай перамозе новых — сацыялістычных — узаемаадносін у нашай краіне. Ужо не адны намаганні, не сам працэс будаўніцтва, а іх рэальны плён, іх канкрэтныя вынікі ў працы, у быце, у чалавечай псіхалогіі становяцца матэрыялам, тэмай і пафасам лепшых паэм 30-х гадоў.

І тут трэба перш за ўсё назваць паэму А. Куляшова «У зялёнай дуброве», якая ў светлых, сонечных вобразах, у лёгкіх, песенных рытмах услаўляе жыццё, калектыўную працу, маладосць і каханне. Героі куляшоўскай паэмы — калектывісты, неад'емна звязаныя з вялікай чалавечай сядружнасцю, але кожны з іх — асоба, даследаваная паэтам ва ўсёй непаўторнасці яе характару, яе індывідуальнага быцця.

Такімі непаўторнымі чалавечымі постацямі ўвайшлі ў нашу свядомасць і звенняваа калгаса «Чырвоная зорка» Хрысціна, і яе каханы, трактарыст Іван, і гарманіст Васіль з яго нешчаслівым каханнем да Хрысціны, і ў нашых сэрцах дагэтуль гучыць то радасная, то сумна-лірычная мелодыя паэмы пра людзей новай вёскі, новага свету, пра іх няпростыя, але багатыя ўнутраным зместам і вольныя ад усякай няшчырасці і эгаізму чалавечыя ўзаемадачыненні:

Не зналі ўсе чыста
І маці не знала,
Калі трактарыста,
Яна пакахала...
Вось елачка тая
Над ціхай мясцінай,
Дзе Першага мая
Ён страўся з Хрысцінай...

Беларуская паэма актыўна рыхтавала сябе да тых часоў, калі ўсяму народу прыйдзецца са зброяй у руках абараняць родную зямлю ад варожага нашэсця. Веданне таго, што «мы жывём на граніцы» (так называўся адзін з даваенных зборнікаў Куляшова), ніколі не пакідала нашых паэтаў.

Такія розныя і непадобныя па мастацкіх асаблівасцях паэмы, як «Праз горы і стэп» П. Броўкі, «Над Бярозай-ракой» П. Глебкі, «Песня аб разведчыках» А. Куляшова, мелі шмат агульнага ў тым сэнсе, што, паэтызуючы подзвігі байцоў грамадзянскай вайны, яны выхоўвалі чытача (і асабліва маладога) у духу палымянага савецкага патрыятызму, гартавалі яго мужнасць, яго гатоўнасць змагацца, перамагаць у новых ваенных выпрабаваннях.

Старажытная мудрасць сцвярджала: калі грымяць гарматы, маўчаць музы. Вопыт нашай барацьбы з фашызмам абверг гэтую мудрасць: у гарматным громе і грукаце быў добра чуцен голас нашых адмабілізаваных муз. Ды яшчэ якіх! Тых, што, згодна з традыцыяй, вымагаюць спакою, цішыні, «дыстанцыі», — эпічных муз.

Неверагодна, але факт: у ваенныя гады, калі над беларускім народам, над яго нацыянальным быццём навісла смяртэльная небяспека, дасягнула агромністых поспехаў беларуская эпічная паэма.

Такія творы, як «Сцяг брыгады» і «Цымбалы» А. Куляшова, «Беларусь», «Паэма пра Смалячкова» і «Ясны кут» П. Броўкі, «Адплата» і «Суд у лесе» Я. Коласа, «Янук Сяліба» М. Танка, «Эдэм» З. Астапенкі, «Мой майстар» А. Бялевіча, якраз і раскрылі — і кожны па-свойму, сваімі адметнымі сродкамі — масавы гераізм народа, які ўзняўся, каб адстаяць сацыялістычную бацькаўшчыну і вольнае савецкае жыццё, назапашаныя на працягу стагоддзяў бессмяротныя скарбы нацыянальнай культуры, самое існаванне беларусаў як нацыі.

Вобраз запалоненай ворагам роднай зямлі і вобразы тых, хто бязлітасна і самаахвярна змагаецца за яе вызваленне, паўстаюць перад намі з праўдзівых, поўных стрыманага драматызму радкоў куляшоўскага «Сцягу брыгады». Жывую карціну станаўлення партызанскага руху, партрэты яго радавых удзельнікаў дала нам паэма «Янук Сяліба» М. Танка, паэта, які, дарэчы, яшчэ да 1939 года стварыў такія ўзоры эпічнага жанру, як «Нарач», «Каліноўскі» і «Сказ пра Вяля». Абагульнены, «вышынны» вобраз роднай краіны — у паэмах П. Броўкі, у прыватнасці, у такіх радках пра партызанскага важака Каліну:

Дзяўчаты са ўсёй Беларусі пачулі —
Збіраюць яму васількі на кашулю,
І маці праз доўгія, сумныя вёсны
Ткуць пояс квяцісты герою на кроснах,
Чакаюць крыніцы яго ледзяныя,
Лясы, паўзнімаўшы смыкі смаляныя,
Каб разам з вятрамі наладзіць вяселле...

Беларуская паэма першых пасляваенных год яшчэ ў вялікай меры жыла «зарадам» вайны, яе пякельнай памяццю. Але адначасова яна малявала карціну мірнага будаўніцтва, раскрывала пачуцці і думы ўчарашняга салдата і партызана, сённяшняга будаўніка, яго непахісную волю падняць з папялішчаў разбураны вайною родны край.

І зноў, як на папярэдніх этапах свайго развіцця, наша пасляваенная паэма, нязменна захоўваючы вернасць прынцыпам народнасці і сацыялістычнага рэалізму, шырока раскрывала ўсё багацце і ўсю разнастайнасць сваіх стылявых асаблівасцей і адзнак.

Мы чыталі ў гэтыя гады і лірычную, з моцным апавядальным элементам паэму-споведзь А. Куляшова «Толькі ўперад», і публіцыстычную паэму П. Панчанкі «Маладосць у паходзе», і напісаную ў класічных, купалаўскіх традыцыях фальклорна-песенную паэму «Хлеб» П. Броўкі, і сюжэтна-апавядальную «Сям'ю» А. Бялевіча, і сатырычную «Аповесць пра залатое дно» А. Зарыцкага.

У першыя пасляваенныя гады В. Таўлай закончыў сваю работу над паэмамі «Песня пра сухар» і «Таварыш» — пра нязломную мужнасць пралетарскага рэвалюцыянера-падпольшчыка, пра баявую інтэрнацыянальную еднасць камуністаў усіх краін.

А далей чытач беларускай паэзіі атрымаў такія паэмы, як «Праводзіны» М. Лужаніна, «Голас сэрца» П. Броўкі, «Беларуская Арыядна» Ул. Дубоўкі, «Штодзённы лістапад» С. Гаўрусёва, «Патрыятычная песня» П. Панчанкі, «Яго Вялікасць» А. Русецкага, «Вецер з Волгі» А. Вялюгіна, «Заазер'е» А. Вярцінскага, «Беларуская калыханка» В. Віткі, «Цунамі» А. Куляшова...

Наўрад ці можна пагадзіцца з думкай аб тым, што сучасная беларуская паэма перажывае крызіс, што яна ў заняпадзе і г. д. Не, сучасная паэма жыве, яна актыўна шукае, абнаўляе свае шляхі, імкнучыся ўвасобіць гераічныя справы савецкага чалавека, раскрыць сусветны, нават «планетарны», рэзананс яго дзейнасці, яго багаты ўнутраны свет, паглыбляючыся ў гісторыю народа, плённа карыстаючыся вопытам рамана і драмы, сінтэзуючы гэты вопыт у сваіх «паэмных» мэтах — у мэтах адлюстравання вяршынных момантаў жыцця краіны і чалавецтва.

На ўсіх этапах свайго развіцця беларуская паэма была летапісам жыцця краіны, раскрывала духоўнае багацце адкрытай Кастрычнікам новай эпохі, шукала шляхі да больш поўнага ўвасаблення гераічнага характару народа — воіна, сейбіта, будаўніка.

Узятыя разам, нашы паэмы даюць яркую карціну вялікіх дзей і здзяйсненняў беларускага народа на працягу слаўнай рэвалюцыйнай эпохі.

ТУТ ЗАЧЫНАЎСЯ СПЕЎ

ДА 170-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ А. МІЦКЕВІЧА

ЗАВОССЕ — радзіма Адама Міцкевіча — звычайны ўбогі шляхецкі засценак. Сялянская хата на два няроўныя канцы (у святліцы жылі самі, у бакоўцы — служанка). Высокая саламяная страха, ганачак на драўляных слупах, пад вокнамі ў агародчыку кветкі. Недалёка ад хаты свіронак, крыху збоку — прасторны хлявец. Побач высока ў неба нацэліўся калодзежны журавель. На прыгуменні бярозы, за імі гумно. Палявая сцяжынка за гумном уздымаецца на ўзгорак, а адтуль выкіроўваецца на навагрудскі гасцінец.

Гэтай сцяжынкай жыццёвыя пуцявіны неўзабаве прывялі Адама ў Навагрудак. Бацька яго, каморнік Мікалай Міцкевіч — прадстаўнік збяднелай беларускай шляхты — займаўся адвакацкай практыкай пры мясцовым судзе. Жылося нялёгка, заработкі былі малыя, пераходзілі з кватэры на кватэру. Бацька сяк-так агораў пляц і пачаў будаваць за пазычаныя грошы мураванку.

Так памалу ішло жыццё. Адам пайшоў у павятовую школу, але стыхія беларускага народнага жыцця запаланіла яго юнацкае сэрца. Маляўнічая Замкавая гара з велічэзнымі вежамі, Налібоцкія і Кушалёўскія дрымучыя лясы, паездкі ўлетку на Нёман ці на Свіцязь, палёт каметы, пажар у Навагрудку — усё гэта пакідала след, абуджала цягу да паэтычнага слова. Любіў хлопчык доўгія зімовыя вечары, калі за акном лютавала завея, а старая служка Альжбета за кудзеляю баяла бясконцыя казкі ці апавядала розныя неверагодныя былі. З радасцю ехаў Адам на святы ці вяселле ў Завоссе ці вёску Руту.

Пасля — студэнцкія клопаты, вучоба на настаўніцкім аддзяленні Віленскага універсітэта. А. Міцкевіч становіцца актыўным членам тайных студэнцкіх таварыстваў, на пасяджэнні якіх разглядаліся не толькі літаратурныя, але і грамадска-палітычныя пытанні.

Улетку віленскаму студэнту не сядзелася ў Навагрудку. Ён блукаў па ваколіцах, наведваў школьнага сябра Яна Чачота, з цікавасцю ездзіў на кірмаш у Сталавічы. Вабіла яго і гістарычнае мінулае роднага краю. Каб пазнаёміцца з гістарычнымі матэрыяламі, А. Міцкевіч тыднямі праседжваў у Шчорсах, дзе была багатая бібліятэка і захоўваліся цікавыя рукапісы па гісторыі Беларусі і Літвы. Цягнула ў Шчорсы.

Летам 1818 года паэт пазнаёміўся ў Тугановічах з Марыляй Верашчак, палымянае пачуццё кахання да якой пранёс праз усё сваё жыццё і паэтычную творчасць. Пачаліся незабыўныя сустрэчы з каханай пад тугановіцкімі ліпамі і на беразе легендарнай Свіцязі. Каханне акрылила паэта, шырокім струменем паплыла рака шчырай і сардэчнай паэзіі, поўнай жыцця і глыбокіх пачуццяў.

Але заканчвалася вучоба, трэба было ехаць настаўнічаць. А. Міцкевіч марыць застацца ў родным Навагрудку, каб быць паблізу да хворай маці і каханай. Але спадзяванні, што ў Навагрудку адчыніцца гімназія, не спраўдзіліся і прыйшлося паэту ехаць у Коўна. Пайшлі дні трывогі і смутку, а тут яшчэ і цяжкія выпрабаванні звaліліся на галаву маладога настаўніка: у кастрычніку 1820 года памёрла маці, у лютым 1821 — выйшла замуж Марыля Верашчак. Пацягнуліся яшчэ больш пакутлівыя дні, калі настаўніцкая служба стала абрыдлым цяжарам, а сэрца рвалася на радзіму. Летам 1821 года А. Міцкевіч, нарэшце, трапляе ў родныя мясціны, дзе ўсё напамінала пра маці, пра сустрэчы з каханай Марыляй.

Далейшыя абставіны жыцця А. Міцкевіча склаліся так, што ён назаўсёды пакінуў Навагрудчыну, але любоў і замілаванасць да краю маладосці пранёс праз усе далёкія і нялёгкія вандроўкі. Куды б ні кідаў яго лёс — у Крым ці далёкія Альпы, у Парыж ці Лазану, у Рым ці Канстанцінопаль, — ён ніколі не забываўся пра Навагрудак, цікавіўся грамадскімі падзеямі, якімі жыла яго радзіма, ніколі не губляў надзеі вярнуцца ў родныя і дарагія мясціны.

Не толькі жыццё, але ўся паэтычная творчасць вялікага польскага паэта цесна звязана з беларускай зямлёю, беларускім фальклорам, беларускай гісторыяй. Цудоўныя малюнкі Наднямоння, народныя песні і паданні, гераічнае мінулае Навагрудчыны, жыццё беларускага народа і збяднелай шляхты, — усё гэта было той невычэрпнай крыніцай, з якой А. Міцкевіч браў сюжэты і вобразы для сваіх бессмяротных твораў. Як сапраўды вялікі мастак, ён творча ставіўся да народных здабыткаў, насычаў іх сацыяльным зместам, уздымаў да ўзораў сусветнай паэзіі. Адам Міцкевіч, як Пушкін, Купала і Шаўчэнка, належыць да ліку тых паэтычных волатаў, якія бралі ў народа іскрынку, каб вярнуць яму зыркае вогнішча паходні, што асвятляла шлях барацьбы з рэакцыяй і прыгнётам.

Як паэт-дэмакрат і барацьбіт за шчасце народаў, А. Міцкевіч вырастаў на беларускай народнай глебе. Беларуская песня, казка, легенда прыйшлі да яго, як правільна адзначае Максім Рыльскі, раней, чым кніжная польская літаратура. Гэта пад уплывам беларускага фальклору абудзілася рамантычная душа польскага паэта, гэта пад уплывам беларускіх паданняў А. Міцкевіч стварыў свае балады «Свіцязь», «Свіцязянка», «Рыбка», «Курганок Марылі», «Люблю я» і многія іншыя, якія сталі самай яркай і жывой старонкай польскай паэзіі XIX стагоддзя. Глыбокія пачуцці закаханага, боль юнацкага сэрца, сардэчная любоў да радзімы і простых людзей, смелыя парыванні вольналюбівай думкі, народныя матывы, вобразы і сімволіка, — усё гэта надавала баладам незвычайную прыгажосць. Аўтар балад смела ўводзіў у свае творы жывую беларускую лексіку (бульба, дзяцеліна, пацеркі, вечарынка, зажынкі, дасеўкі, глячок і інш.), якую цяпер некаторыя каментатары міцкевічаўскай творчасці сарамліва тлумачаць як «правінцыялізмы». Не, гэта жывыя беларускія словы, якія А. Міцкевіч чуў змалку і лічыў літаратурнай нормай.

Рэха беларускіх народных гістарычных песень і паданняў, а таксама паасобныя гістарычныя звесткі, на якія натрапіў А. Міцкевіч у Шчорсаўскай бібліятэцы, былі выкарыстаны ў паэмах «Гражына» і «Канрад Валенрод». Беларуская міфалогія і народныя звычаі Навагрудчыны сталі асновай славутай паэмы «Дзяды» — самага моцнага твора па сіле сацыяльнага пратэсту і рэвалюцыйнай накіраванасці.

Цяжка сумуючы па роднай Беларусі, А. Міцкевіч піша ў Парыжы апошні свой вялікі твор — паэму «Пан Тадэвуш», які быў развітальнай песняй дарагой Навагрудчыне. У гэтай паэтычнай эпапеі на шырокім грамадскім фоне паказана жыццё, звычаі і норавы беларуска-польскай шляхты, створаны яркія малюнкі народнага побыту і навагрудскіх ваколіц. Над гэтым творам паэт працаваў з вялікім захапленнем: «Пішу многа; ...я жыву ў Літве, бачу перад сабою лясы, карчму, шляхту, яўрэяў і г. д. Калі б не паэма, я збег бы з Парыжа».

Няхай не бянтэжаць тэрміны «Літва» і «літоўскі» ў творах польскага паэта. А. Міцкевіч, як вядома, пачаў «Пана Тадэвуша» словамі «Літва — мая айчына...». Трэба памятаць, што ў першай палове мінулага стагоддзя тэрміны «Літва» і «літоўскі» ўжываліся не для вызначэння этнаграфічнай, а гістарычнай Літвы — княства Літоўскага.

У эпілогу да «Пана Тадэвуша» А. Міцкевіч выказаў сваю мару:

О, мне дажыць бы да гэткай уцехі,
Каб мае трапілі кнігі пад стрэхі,
...Каб і мае ўзялі кнігі сялянкі,
Простыя кнігі, як іх калыханкі...

Спадзяванні паэта спраўдзіліся: сёння яго творы ў перакладах пайшлі па шырокім свеце, трапілі на ўсе кантыненты. Як родных Янку Купалу і Якуба Коласа, ушаноўвае беларускі народ і свайго земляка, вялікага польскага нацыянальнага паэта.

Сцяпан АЛЕКСАНДРОВІЧ.

ГІСТОРЫЯ АДНОЙ ПЕСНІ

У 1938 годзе ў вёсцы Пудзіна на Навагрудчыне я запісаў лірычную народную песню:

Вей жа, вольны вецер,
Скрозь па чыстым полі,
І шукай усюды
За мяне ты долі.
Праляці зямлёю
Скрозь па свеце цалым
І шукай мне долі,
Я шукаць не ўмею.
Можа, яна блудзіць
Па лясах, пустынях,
Можа, ў пустках дзікіх
Дзе яна загіне.
Можа, злыя людзі
Дзе яе спаймалі
І ў замкі, жалеза
Яе закавалі.
І яна не можа
Вырвацца на волю,
Ўсе яе пільнуюць,
Не даюць патолю.
А калі дзе знойдзеш,
То вядзі з сабою.
Хаця на мінутку
Пацешусю ёю.
Пагляджу, пабачу,
Што з яе за дзіва,
Ці папраўдзе можна
З ёю жыць шчасліва.
А табе за гэта,
Вецер, адплачуся,
Перад тваёй моцай
Нізка пакланюся.

Спявалі гэтую песню на мелодыю вядомай украінскай песні «Веюць ветры, веюць буйны».

У 1946 годзе гэтую ж самую песню давялося мне пачуць у вёсцы Бурносы на Лідчыне, а ў 1953 годзе — на хутары Карчава Налібацкага сельсавета Навагрудскага раёна.

Песня мяне зацікавіла. Тое, што напісана яна не характэрным для народнай паэзіі памерам — трохстопным харэем, змушала думаць, што песня прыйшла ў народ з літаратуры. Пачаў шукаць першакрыніцу. Аказалася, што песня «Вей жа, вольны вецер» — гэта (з невялікімі адхіленнямі) верш Цішкі Гартнага «Ветру», напісаны ў 1912 годзе.

Як жа ён трапіў на Навагрудчыну?

Летам гэтага года я зноў наведаў Пудзіна і Бурносы, сустракаўся і гутарыў са старэйшымі людзьмі. Высветлілася, што ў гэтыя вёскі песня прыйшла з вёскі Каўкелі Морынскага сельсавета Іўеўскага раёна.

Паехаў у Каўкелі. Тут мне расказалі, што гэтую песню першы пачаў спяваць майстар-калаўротчык, аматар спеваў Аляксандр Дудко, і пераілі пагаварыць з яго братам, Іванам Дудко.

Іван Сцяпанавіч пры сустрэчы расказаў мне, што яго брат Аляксандр, вярнуўшыся ў 1918 годзе з царскай арміі, прынёс з сабой многа розных беларускіх кніжак. Сярод гэтых кніжак быў песенник, надрукаваны «польскімі» літарамі (лацінкай). З гэтага песенніка і былі ўзяты словы песні «Вей жа, вольны вецер».

— Харошыя, праўдзівыя словы і мелодыя, поўная народнага гора, мары аб лепшым жыцці, — расказваў Іван Сцяпанавіч, — палюбіліся людзям. Песню пачалі спяваць многія пудзінцы.

— А мелодыя? Як і хто падабраў мелодыю?

— От гэта не магу сказаць, — адказаў Іван Сцяпанавіч. — Так яе спяваў брат, так і цяпер спяваюць старыя жанчыны, каторыя помняць.

Дарэчы, цікава адзначыць, што Аляксандр Сцяпанавіч Дудко (пра гэта расказваў не толькі яго брат, але і іншыя пудзінцы) да самай сваёй смерці (загінуў ён у 1941 годзе) збіраў беларускія кнігі, часопісы, газеты, розныя адозвы і пракламацыі, якія выпускаліся і распаўсюджваліся на Навагрудчыне ў гады панавання буржуазнай Польшчы. У ягонай бібліятэцы меліся першыя выданні твораў Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, камплекты «Нашай долі» і «Нашай нівы», легальныя і падпольныя выданні перыяду 1920-39 гадоў. Цікавіўся Аляксандр Сцяпанавіч і вуснай народнай творчасцю, запісваў народныя песні, прымаўкі, пагаворкі. Усё гэта, на вялікі жаль, загінула ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

От і ўся гісторыя адной песні. Застаецца толькі дадаць, што песенникам, які прынёс у родную вёску Аляксандр Дудко, быў, мусіць, першы зборнік вершаў Ц. Гартнага, выдадзены лацінскімі літарамі выдавецтвам «Загляне сонца і ў наша ваконца» ў 1913 годзе пад назвай «Песні».

Ул. УРБАНОВІЧ.

прынцыпаў эканамічнай палітыкі, выкарыстанні вылічальнай тэхнікі ў плануванні і кіраўніцтве і г. д. У дадатак да сямі ранейшых сектараў інстытута сёлета створаны новы — сектар эканамічнай кібернетыкі.

Калі ад эканамістаў павярнуць налева — трапіш да літаратараў, направа — да лінгвістаў. Зойдзем спачатку да лінгвістаў. У Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа, які ўзначальвае кандыдат навук М. Р. Суднік, даследуюць актуальныя праблемы беларускай і славянскай лінгвістыкі. Плён працы інстытута чытачы добра ведаюць: гэта двухтомны «Дыялекталагічны атлас», нарматыўная «Граматыка беларускай мовы» таксама ў двух тамах, руска-беларускі і беларуска-рускі слоўнікі і многія іншыя выданні. Зараз навуковыя супрацоўнікі інстытута працуюць над новымі слоўнікамі (нарматыўным, тлумачальным, этымалагічным і слоўнікам старабеларускай мовы), удзельнічаюць у складанні агульнаславянскага лінгвістычнага атласа, які рыхтуюць мовазнаўцы ўсіх славянскіх краін. У гэтым годзе завяршаецца работа над калектыўнай кнігай «Гістарычная лексікаграфія беларускай мовы», у якой будуць прасочаны шляхі развіцця слоўнікавага складу ад старажытнарускай эпохі да нашага часу.

А цяпер пройдзем паўкруглым калідорам-балконам да Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы. Пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта АН БССР В. В. Барысенкі тут працуе зладжаны калектыў вучоных, якія выдалі каля трох дзесяткаў кніг пра творчасць нашых пісьменнікаў. Вы, паўна, чыталі зборнікі прац інстытута «Беларуская літаратура. Даследаванні і публікацыі». І, напэўна ж, карыстаецеся двухтомнікам «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры». Важным дадаткам да яе будуць падрыхтаваныя інстытутам яшчэ два тамы «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры». Вы добра ведаеце тамы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча. Зборы іх твораў рыхтавалі тэкстолагі інстытута. Цяпер яны працуюць над сямітомнікам Купалы, васьмітомнікам Чорнага і пятнаццацітомнікам Коласа. Супрацоўнікі інстытута прымаюць удзел у стварэнні «Гісторыі савецкай літаратуры» і «Гісторыі сусветнай літаратуры».

А зараз пакінем галоўны корпус і заснежаным скверам пройдземся да першага ў стройнай лініі шматпавярховых будынкаў, у якіх размясціліся іншыя інстытуты акадэміі. Ля ўваходу — дзве чырвоныя шыльды: «Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Інстытут фізікі» і «Рэдакцыя ўсесаюзнага часопіса прыкладной спектраскапіі». У Мінску, а ўсесаюзны! І не адзін, дарэчы. Выдаюцца тут і саюзныя «Інжынерна-фізічны часопіс» і «Дыферэнцыяльныя ўраўненні».

Чырванасцяжны інстытут фізікі — адзін з вядучых навуковых цэнтраў краіны ў галіне спектраскапіі і люмінесцэнцыі. У ім працуе больш як 450 чалавек. Дырэктар інстытута акадэмік АН БССР Б. І. Сцяпанаў — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, заслужаны дзеяч навукі БССР, напярэдадні 50-годдзя Кастрычніка ўзнагароджаны залатым медалем імя С. І. Вавілава за выдатныя навуковыя працы ў галіне фізікі. Інстытут даследуе ўзаемадзеянні святла і рэчыва, працуе над удасканаленнем квантавых генератараў (лазераў). Створана свая, арыгінальная апаратура для дыягностыкі нізкатэмпературнай плазмы.

Па суседстве — светла-шэры корпус Інстытута фізіка-арганічнай хіміі. Даследаванні, якія праводзяцца хімікамі, маюць не толькі тэарэтычнае, але і важнае народнагаспадарчае значэнне. Пад кіраўніцтвам акадэміка М. С. Казлова група вучоных распрацавала, напрыклад, новыя метады аднаўлення каталітычнай актыўнасці адпрацаванага алюмаплацінавага каталізатара для Полацкага нафтаперапрацоўчага завода.

Калі крыху збочыць з вуліцы на заслоненую гмахамі карпусоў плошчу акадэмічнага гарадка, вашу ўвагу прыцягне пяціпавярховы будынак, сцены якога выкладзены белай і аблямаваны чырвонай цэглай. Гэта — Інстытут арганічнай хіміі. Яго вучоныя распрацавалі новую тэхналагічную схему ўзбагачэння або папярэдняга паляпшэння калійных солей. Выкарыстанне яе на адным з Салігорскіх камбінатаў дае каля двух мільёнаў рублёў эканоміі ў год.

А цяпер прагуляемся аж да стыку Акадэмічнай і Друкарскай вуліц, дзе высіцца светлы з цёмным падмуркам пяціпавярховы корпус. Ля парадных дзвярэй яго аж пяць шыльд: «Аддзел фізіялогіі і сістэматыкі ніжэйшых раслін», «Інстытут генетыкі і цыталогіі», «Аддзел мікрабіялогіі», «Інстытут эксперыментальнай батанікі», «Аддзел заалогіі і паразіталогіі». Назвы гавораць самі за сябе.

Аддзелам фізіялогіі і сістэматыкі ніжэйшых раслін загадвае прэзідэнт Акадэміі навук БССР Васіль Феафанавіч Купрэвіч. Вядомы свету біёлаг, аўтар грунтоўных прац па важных тэарэтычных і практычных пытаннях батанікі і раслінаводства, В. Ф. Купрэвіч у бурныя рэвалюцыйныя часы быў камандорам эскадранага мінаносца «Самсон», удзельнічаў у кастрычніцкіх падзеях. Цяпер вучоны займаецца праблемамі жыцця чалавека: зусім нядаўна вы маглі прачытаць у «Літературнай газеце» яго цікавы артыкул «Даўгалецце: рэальнасць мары», дзе на пытанне «Ці можа чалавек жыць даўжэй?» Васіль Феафанавіч упэўнена адказвае: «Я сцвярджаю: так, можа. Павінен!»

Ад біёлагаў нам лацвей пайсці за развілку вуліц, спусціцца крыху па Акадэмічнай і збочыць направа — нас чакаюць яшчэ два карпусы-суседзі. Фізіка-тэхнічны інстытут. Яго тэматыка вызначаецца выключнай актуальнасцю. Тут, напрыклад, створана і рэкамендавана прамысловасці адмысловая канструкцыя ратацыйнага інструмента для апрацоўкі плоскіх паверхняў. Мінскі завод аўтаматычных ліній, Аршанскі завод швейных машын, укараніўшы гэтую навінку, эканомяць да 350 тысяч рублёў у год. Адзін з інструментаў, сканструяваных у інстытуце, атрымаў залаты медаль на Лейпцыгскай выстаўцы 1967 года.

Побач — пяціпавярховы будынак Інстытута цепла- і масаабмену. У сваёй галіне гэта вядучая навуковая ўстанова краіны. На падставе даследаванняў абмену цяпла і вільгаці ў капілярна-порыстых целах створаны высокаінтэнсіўны спосаб тэрмічнай апрацоўкі вільготных матэрыялаў. Прапанаваныя нашымі вучонымі прамысловыя ўстаноўкі для сушкі драўніны, антыкаразійных пакрыццяў і тэрмічнай апрацоўцы жалезабетонных вырабаў з поспехам выкарыстоўваюцца на суднабудаўнічых заводах у Нікалаеве і Херсоне, на домабудаўнічых камбінатах Мінска, Уфы, Баранавіч, Уладзівастока і іншых гарадоў.

Цяпер будзем пакрысе вяртацца да пачатковага пункту нашай экскурсіі — да галоўнага корпуса. Па дарозе завітаем яшчэ ў адзін са светла-шэрых карпусоў, дзе размяшчаюцца Інстытут матэматыкі і Інстытут тэхнічнай кібернетыкі. Абодва арганізаваны не так даўно, але могуць пахваліцца немалымі поспехамі. Інстытут тэхнічнай кібернетыкі — міжгаліновая арганізацыя па ўкараненні матэматычных метадаў і вылічальнай тэхнікі ў машынабудаванні. Тут распрацаваны метады стварэння алгарытмаў і рабочых праграм для канструявання і мадэлявання працэсаў тэхнічнай падрыхтоўкі вытворчасці.

Шмат можна было б расказваць і пра Інстытут ядзернай энергетыкі. 300 навуковых супрацоўнікаў яго на чале з вядомым у краіне вучоным-акадэмікам А. К. Красіным вядуць на атамным рэактары вялікія і важныя даследаванні. Імя А. К. Красіна вядома далёка за межамі СССР — ён прымаў удзел ва ўзвядзенні першай савецкай атамнай электрастанцыі.

Вось і падышла к канцу наша экскурсія. Вы прынялі ў ёй удзел напярэдадні знамянальнай падзеі ў жыцці рэспублікі — яе залатога юбілею. У гэтыя ж дні Акадэмія навук адсвяткуе яшчэ адну дату — сваё саракагоддзе.

Наперадзе новыя шляхі, новыя вышыні, якімі з поспехам авалодае беларуская навука.

ВОДГУКІ, АДКАЗЫ

ПАЧЫНАЮЦЦА РАМОНТНЫЯ РАБОТЫ

Магілёўскі абком КП Беларусі паведамляе, што факты, прыведзеныя ў артыкуле П. Місько «Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі...», які быў надрукаваны ў «Літаратуры і мастацтве» 17 верасня 1968 г., адпавядаюць сапраўднасці.

У апошні час прыняты некаторыя меры, каб ліквідаваць недахопы, указаныя ў крытычным выступленні газеты.

Улічаны ўсе помнікі гісторыі, культуры і архітэктуры на тэрыторыі вобласці. На ўсе помнікі складзены пашпарты. Падрыхтавана тэхнічная дакументацыя на рамонт будынка былой Мікалаеўскай царквы ў Магілёве і царквы ў Слаўгарадзе. На рамонтныя работы, якія правядзе абласны рамонтна-будаўнічы трэст, аблвыканком выдзеліў неабходныя грашовыя сродкі. Рыхтуецца таксама дакументацыя на рамонт гістарычнага помніка ў вёсцы Лясная.

Навукова-рэстаўрацыйным вытворчым майстэрням Міністэрства культуры БССР заказана дакументацыя на рамонт і рэстаўрацыйныя работы ў 1969—1975 гг. у Мсціслаўскім касцёле, магілёўскім кафедральным касцёле, у замку Сапегі ў Быхаве і інш. Грошы на гэта аблвыканком выдзеліў.

Абласному ўпраўленню культуры, краязнаўчым музеям і абласному аддзяленню Таварыства па ахове помнікаў гісторыі, культуры і архітэктуры прапавана ўзмацніць прапаганду мастацкіх каштоўнасцей помнікаў.

Л. БАРАБАНАВА,
сакратар Магілёўскага абкома КП Беларусі.

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Ахова здароўя. Фізкультура і спорт Беларусі. Альбом. На беларускай і рускай мовах. Аўтары тэксту А. Траяноўскі і А. Майскі. Фатаграфіі А. і М. Ананьіных, В. Бараноўскага, Ю. Іванова, У. Казлова, Л. Папковіча, Д. Прэса, Э. Трыгубовіча,

ІМ ПРЫСВОЕНЫ ГАНАРОВЫЯ ЗВАННІ

ГАРБАТОЎСКІ Віктар Ціханавіч, заслужаны дзеяч культуры БССР. Скончыў Віцебскае музычнае вучылішча. З 1959 года працуе мастацкім кіраўніком Рускага народнага хору Віцебскай фабрыкі «КІМ». Калектыў вызначаецца высокім выканаўчым майстэрствам.

КАЗАЧКОЎ Эдуард Ашэравіч, заслужаны дзеяч культуры БССР. Скончыў Маскоўскі інстытут ваенных дырыжораў і завочна Беларускую дзяржаўную кансерваторыю. З 1957 года працуе ваенным дырыжорам. Аўтар многіх музычных твораў. Член Саюза кампазітараў. Пад яго кіраўніцтвам Гродзенскі самадзейны сімфанічны аркестр дабіўся выдатных поспехаў.

КІСЯЛЕВА Людміла Уладзіміраўна, заслужаны дзеяч культуры БССР. Скончыла Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага. З 1957 года працуе загадчыцай экскурсійна-масавага аддзела Музея абароны Брэсцкай крэпасці.

КОМІК Якаў Аляксеевіч, заслужаны дзеяч культуры БССР. 14 гадоў працуе кінамеханікам Хорскатурскага кінастацыянара Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Шмат разоў выходзіў пераможцам у сацыялістычным спаборніцтве кінамеханікаў Брэстчыны, дабіўся высокай культуры абслугоўвання насельніцтва.

САПЕШКА Станіслаў Захаравіч, заслужаны дзеяч культуры БССР. Скончыў Ленінградскі педагагічны інстытут імя Герцэна. З 1948 года працуе ва ўстановах культуры рэспублікі. Доўгі час быў намеснікам дырэктара Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Зараз — дырэктар Дзяржаўнага музея БССР.

СЕРЫКАЎ Іван Арцёмавіч, заслужаны дзеяч культуры БССР. Вучыўся ў Мінскім харэаграфічным вучылішчы, працаваў у Ансамблі песні і танца БССР, — у ансамблі ЧБВА. З 1960 года — мастацкі кіраўнік народнага ансамбля песні і танца «Маладосць» Палаца культуры ўпраўлення бытавога абслугоўвання насельніцтва Віцебскага аблвыканкома.

СМАЛЯР Васіль Пятровіч, заслужаны дзеяч культуры БССР. У 1934 годзе скончыў Вышэйшую камуністычную сельскагаспадарчую школу імя У. І. Леніна ў Мінску. Працаваў на партыйнай рабоце, быў намеснікам міністра кінематаграфіі БССР, дырэктарам студыі «Беларусьфільм». З 1962 года працуе сакратаром праўлення Саюза кінематаграфістаў БССР.

ТАРАН Уладзімір Васільевіч, заслужаны дзеяч культуры БССР. У 1964 годзе скончыў Мінскае музычнае вучылішча. З 1958 па 1965 год — дырэктар Стаўбцоўскага раённага Дома культуры. З 1965 года — дырэктар Стаўбцоўскай музычнай школы.

УДАРАЎ Георгій Гаўрылавіч, заслужаны дзеяч культуры БССР. Працаваў артыстам ансамбля песні і танца філармоніі ў г. Арле, артыстам ансамбля песні і танца ў г. Маладзечна. Скончыў Мінскае музычнае вучылішча імя Глінкі і з 1963 года працуе мастацкім кіраўніком народнага хору «Маладосць» рэспубліканскага Дома культуры прафтэхадукацыі.

ЮШАНКОЎ Іван Рыгоравіч, заслужаны дзеяч культуры БССР. З 1954 года працуе загадчыкам аддзела культуры выканкома Баранавіцкага раённага Савета дэпутатаў працоўных. Раён дабіўся вялікіх поспехаў у развіцці культуры і самадзейнай мастацкай творчасці.

НАРОДНЫ СКАРБ

Пленум Цэнтральнага савета рэспубліканскага Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры абмеркаваў праект Закона Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі «Аб ахове помнікаў гісторыі і культуры».

Да рэвалюцыі не існавала спецыяльнага заканадаўства аб ахове помнікаў гісторыі, архітэктуры, мастацтва. Толькі Будаўнічы статут і інструкцыі Археалагічнай камісіі ў некаторай ступені забаранялі зносіць ці перарабляць будынкі, узведзеныя раней XVIII стагоддзя, самавольна раскопваць курганы і старажытныя паселішчы чалавека.

Маладая рэспубліка Саветаў ужо з першых дзён свайго існавання прыняла рад мер, каб ахаваць помнікі старажытнасці. У красавіку 1918 года У. І. Ленін падпісаў дэкрэт Савета Народных Камісараў «Аб знятці помнікаў, узведзеных у гонар цароў і іх слуг, і распрацоўцы праектаў помнікаў Расійскай Сацыялістычнай Рэвалюцыі». Быў зацверджаны спіс 50 помнікаў «людзям вялікай грамадскай дзейнасці». Важнейшае значэнне мелі дэкрэты Савета Народных Камісараў, выдадзеныя ў сакавіку 1923 года і студзені 1924 года, аб уліку і рэгістрацыі прадметаў старажытнасці, мастацтва і прыроды.

У Беларусі, спачатку ў 1923, а потым у 1926 годзе, Саўнарком рэспублікі аб'явіў дзяржаўнай уласнасцю рад помнікаў мастацтва і старажытнасці, быту і прыроды, былі намечаны некаторыя меры па захаванні такіх помнікаў. Да вайны ў Беларусі не раз выдаваліся розныя пастановы аб ахове помнікаў. У маі 1939 года Саўнарком БССР прыняў пастанову «Аб паляпшэнні аховы помнікаў старажытнасці, гісторыі, рэвалюцыі і мастацтва». Ахова помнікаў ускладалася на аргкамітэты Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР па абласцях, на гарвыканкомы і райвыканкомы. Спецыяльная ўрадавая камісія павінна была скласці пералік помнікаў, вызначыць магчымасці іх рэстаўрацыі і рэканструкцыі.

Але работа была перапынена нападам гітлераўцаў. За час вайны фашысты па-варварску разбуралі найбольш каштоўныя помнікі, рабавалі прадметы мастацтва.

Пасля вайны Цэнтральны Камітэт КП Беларусі і Савет Міністраў БССР неаднаразова прымалі пастановы аб увекавечанні памяці воінаў і партызан, памятных месц і знамянальных падзей, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной, аб добраўпарадкаванні месц захавання загінуўшых, аб паляпшэнні аховы помнікаў гісторыі і культуры. З 1967 года стала працаваць добраахвотнае таварыства па ахове гэтых помнікаў.

Вялікае значэнне мела пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР «Аб стане і мерах паляпшэння аховы помнікаў гісторыі, мастацтва і архітэктуры ў Беларускай ССР» (1967 г.). Згодна з ею ў Міністэрстве культуры рэспублікі была створана Дзяржаўная інспекцыя па ахове помнікаў гісторыі і культуры, адкрыты навукова-рэстаўрацыйныя майстэрні па рамонце і рэстаўрацыі помнікаў.

Як бачна, на працягу ўсёй гісторыі рэспублікі прымаліся меры, каб захаваць ад згубнага ўплыву часу найбольш каштоўныя творы дойлідаў і мастакоў мінулага, увекавечыць знамянальныя падзеі і памятныя месцы.

Наспела жыццёвая патрэба прыняць Закон Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі «Аб ахове помнікаў гісторыі і культуры». Днямі пленум Цэнтральнага савета Таварыства аховы помнікаў абмеркаваў праект гэтага закона.

І дакладчык, намеснік старшыні прэзідыума таварыства Ф. Барысевіч, і ўдзельнікі пленума, што выступілі ў спрэчках, аднадушна адзначалі, што праект Закона адпавядае.

У артыкуле І праекта Закона гаворыцца, што ўсе помнікі гісторыі і культуры, якія маюць гістарычную, навуковую ці мастацкую каштоўнасць і належаць дзяржаве, кааператыўным і грамадскім арганізацыям ці з'яўляюцца ўласнасцю грамадзян, знаходзяцца на ўліку і ахоўваюцца дзяржавай.

Паводле артыкула 7, органы культуры маюць права браць на улік і пад ахову новыя выяўленыя помнікі да таго часу, пакуль яны канчаткова не будуць вывучаны і ўзяты пад ахову дзяржавы, прыпыняць будаўніцтва і іншыя віды работ, звязаныя з помнікамі гісторыі і культуры, калі работа вядзецца з парушэннямі гэтага Закона.

Агульнае адабрэнне ва ўдзельнікаў пленума выклікалі тыя палажэнні праекта Закона, па якіх узмацняецца адказнасць арганізацыі і грамадзян за пашкоджанне помнікаў і ахоўных зон.

— У артыкуле 11 новага Закона запісана, што помнікі гісторыі і культуры рамантуюцца і рэстаўрыруюцца па праектах і планах, якія зацвярджаюцца Міністэрствам культуры БССР, — сказаў у сваім выступленні галоўны архітэктар навукова-рэстаўрацыйных майстэрань В. Сахно. — Гэта вельмі правільна. Дасюль помнікі рамантавалі, як каму ўздумаецца, і тымі падрадчыкамі, якія трапляліся пад руку. Да чаго гэта прыводзіла, бачна з такога прыкладу. Нават на Усесаюзнай нарадзе па рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры і мастацтва, якая праходзіла ў Чарнігаве, ішла гаворка аб «ляпах», дапушчаных у Нясвіжы. Асабліва многа безгустоўшчыны і адсябяціны праявілася ў рамонце Слуцкай брамы. У палаца-замкавым комплексе Радзівілаў многія роспісы забелены і зверху накатаны трафарэтны ўзор, а некаторыя так «падноўлены», што ад мастацтва нічога не засталося. Я згодзен, што помнікі архітэктуры трэба выкарыстоўваць, але трэба і пакідаць мемарыяльныя пакоі ў першапачатковым выглядзе, з тагачасным інтэр'ерам.

— Новай рэдакцыі патрабуе і артыкул 18, — сказаў дырэктар Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея І. Мігулін. — У ім сказана, што пры выяўленні помнікаў гісторыі і культуры ў час земляных работ трэба адразу ж усё спыніць і паведаміць у выканаўчы камітэт. Трэба дапісаць: «а таксама мясцоваму краязнаўчаму музею».

Акадэмік П. Глебка падкрэсліў, што прыняцце такога Закона будзе своечасовым і дзейсным актам. Можна будзе лепш наладзіць выяўленне і ўлік новых помнікаў гісторыі і культуры, лепш ахоўваць і аднаўляць іх. А палепшыць гэтую справу трэба яшчэ і таму, што ёсць загад Міністэрства культуры СССР аб выданні на працягу 10—15 гадоў шматтомнай працы «Звод помнікаў гісторыі і культуры СССР». Некалькі тамоў будзе прысвечана Беларусі. У наступным годзе ў Акадэміі навук адбудзецца спецыяльная канферэнцыя, прысвечаная падрыхтоўцы да выдання гэтай працы.

Начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення культуры М. Шаўчук расказаў аб распрацоўцы праекта рэканструкцыі Камянецкай вежы, аб пачатку будаўніцтва мемарыяльнага комплексу на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці-героя.

Супрацоўніца Дзяржаўнага мастацкага музея БССР Л. Высоцкая, выступаючы на пленуме, прапанавала прадугледзець у новым Законе спецыяльны артыкул, па якім каралася б раскраданне мастацкіх каштоўнасцей. У апошні час паявілася многа калекцыянераў-прыватнікаў, якія шныпараць па бяздзеючых цэрквах, прысвойваюць творы мастацтва, асабліва рэдкія, старажытныя абразы.

У абмеркаванні праекта Закона прынялі таксама ўдзел сакратар ЦК ЛКСМБ А. Ваніцкі, старшыня Віцебскага абласнога аддзялення таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры К. Пятроў, дырэктар Гродзенскага абласнога гісторыка-археалагічнага музея М. Собаль, член прэзідыума Цэнтральнага савета таварыства Ц. Гарбуноў, адказны сакратар Беларускага рэспубліканскага савета ветэранаў вайны генерал-лейтэнант у адстаўцы І. Жыгараў, супрацоўніца Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР А. Місюк, архітэктар Белпрампраекта Т. Хадыка і іншыя. З заключным словам выступіў старшыня прэзідыума Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР І. Клімаў.

Пленум адобрыў праект закона «Аб ахове помнікаў гісторыі і культуры» і звярнуўся ў Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР з просьбай унесці яго на сесію Вярхоўнага Савета БССР для разгляду і прыняцця. Намечана таксама правесці шырокае абмеркаванне праекта Закона сярод грамадскасці рэспублікі праз друк.

І ЗНОЎ «РУСКАЯ ЗІМА»

З 25 СНЕЖНЯ на працягу 10 дзён у Маскве праводзіцца традыцыйнае свята мастацтваў «Руская зіма». Гэта зімовы фестываль, за якім пойдуць вясенняя — «Маскоўскія зоркі» і ленінградскія «Белыя ночы».

У фестывалі ўдзельнічаюць 12 буйнейшых мастацкіх калектываў — Вялікі тэатр, сімфанічныя аркестры, акадэмічныя і народныя хоры, харэаграфічныя ансамблі.

Аб сучасным сваяе «Руская зіма» міністр культуры СССР Кацярына Фурцава расказвае:

— «Руская зіма» — свята мастацтва — сёлета прысвячаецца творчасці народаў Расійскай Федэрацыі. Першыя фестывалі — пошук, але з кожным годам зімовы фестываль заваёўвае ўсё большую папулярнасць у савецкіх і зарубежных гледачоў. Майстэрства савецкіх артыстаў, мастацтва музычных і харавых калектываў прыцягваюць у дні фестывалю сваіх прыхільнікаў.

Галоўная задача «Рускай зімы» — паказ лепшых дасягненняў у галіне мастацтва, а таксама новых маладых талентаў, якія з'явіліся за апошні год. Фестываль пазнаёміць гледачоў з лепшымі класічнымі і сучаснымі творамі рускага нацыянальнага мастацтва — сімфанічнай, опернай, балетнай і камернай музыкай выдатных кампазітараў — Чайкоўскага, Рахманінава, Мусаргскага, Скрабіна, Пракоф'ева, Шастаковіча.

На сцэне Вялікага тэатра і Крамлёўскага Палаца з'ездаў пойдуць оперныя і балетныя спектаклі: «Яўгеній Анегін» і «Пікавая дама» П. Чайкоўскага, «Царская нявеста» і «Садко» М. Рымскага-Корсакава, «Барыс Гадуноў» М. Мусаргскага, «Князь Ігар» А. Барадзіна і «Вайна і мір» С. Пракоф'ева, «Спартак» А. Хачатурана, «Вясна свяшчэнная» І. Стравінскага, «Дон Кіхот» Л. Мінкуса, «Асель» В. Уласава.

Сімфанічныя і камерныя канцэрты адбудуцца ў філармнічных залах сталіцы. Выступяць — Дзяржаўны сімфанічны аркестр Саюза ССР і сімфанічны аркестр Маскоўскай дзяржаўнай філармоніі пад кіраўніцтвам такіх вядомых дырыжораў, як Я. Святланаў, К. Кандрашын, К. Іваноў і малады Ф. Мансураў.

У спектаклях і канцэртах прымуць удзел прызнаныя майстры — Г. Вішнеўская, І. Архіпава, Т. Мілашкіна, І. Пятроў, А. Огніўцаў. Асаблівую ўвагу, безумоўна, прыцягне сумесны канцэрт Святаслава Рыхтэра і Давіда Ойстраха ў Вялікай зале кансерваторыі.

Слухачы пазнаёмяцца з цікавымі прадстаўнікамі мастацкай моладзі вакальнага, фартэпіяннага, скрыпічнага і віяланчэльнага мастацтва. Гэта спевакі В. Атлантаў, Ю. Мазурок, Я. Райкоў, Д. Каралёў, Е. Абразцова, Т. Сіняўская. Інструменталісты — лаўрэаты міжнародных конкурсаў. Сярод іх шаснаццацігадовая Е. Навіцкая — студэнтка Маскоўскай кансерваторыі па класу фартэпіяна прафесара Льва Аборына — выклікала сенсацыю на Міжнародным конкурсе піяністаў у Бруселі сёлетняй вясной, заваяваўшы першую прэмію. Вучаніца выдатнага савецкага віяланчэліста М. Растраповіча — К. Геаргіян, лаўрэат Трэцяга Міжнароднага конкурсу імя П. Чайкоўскага, якая паспяхова гастралірує па краіне і за рубяжом.

Багатыя праграмы прадставяць ансамблі і хоры з розных абласцей Расіі. Гэта перш за ўсё шырока вядомы Дзяржаўны рускі хор СССР, якім кіруе А. Свешнікаў. Старэйшы калектыў беражліва захоўвае і развівае традыцыі рускай музычнай культуры, прапагандуе класіку і новыя творы савецкіх кампазітараў. Харавое мастацтва на фестывалі прадставіць і Акадэмічная харавая капэла на чале з А. Юрлавым. У яе рэпертуары — невядомыя і забытыя творы XVI — XVIII стагоддзяў, творы класікаў XIX стагоддзя і буйнейшых савецкіх кампазітараў.

Зразумець мастацтва рускага народа, яшчэ больш пазнаёміць яго дапамогуць гасцям фестывалю і такія простыя музычныя інструменты, як балалайка або гармонік, уладзімірскі ражок або домра. Аб'яднаныя ў аркестр народных інструментаў імя Н. Осіпава, яны здзіўляюць сваёй напеўнасцю, чысцінёй гуку, зухаватасцю і шырынёй мелодый. Разам з праслаўленым аркестрам выступіць вядомая выканаўца рускіх народных песень і песень савецкіх кампазітараў Людміла Зыкіна.

Аматары рускай песні пачуюць таксама Дзяржаўны акадэмічны рускі народны хор імя М. Пятніцкага, Дзяржаўны рускі Паўночны народны хор. Фальклор Поўначы, дзе спрадвеку жылі пакаленні народных умельцаў, якія захоўвалі і развівалі старадаўнія мастацкія традыцыі, — гэта невычарпальная крыніца для творчасці паэтаў, пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў. Паўночны хор выконвае бытавыя, гістарычныя і харавыя песні, частушкі, песні-скорагаворкі, сказы.

Тых, хто любіць народныя танцы, чакае сустрэча з вядомым харэаграфічным ансамблем «Бярозка». Каля 50 краін усіх пяці кантынентаў наведаў гэты калектыў, пакараючы гледачоў хараством народнага танца.

З танцамі народаў, якія насяляюць Расійскую Федэрацыю, пазнаёмяць і іншыя калектывы: Паўночна-Асецінскі ансамбль танца, Дзяржаўны ансамбль песні і танца Татарскай АССР, Краснаярскі ансамбль танца Сібіры.

Маскоўскі тэатр эстрады пакажа праграму «Зіма-69».

У Маскоўскім цырку будзе ісці новае прадстаўленне — «Неспакойныя сэрцы».

У час фестывалю ў маскоўскіх музеях і карцінных галерэях адкрыюцца цікавыя выстаўкі, новыя экспазіцыі. Адна з іх — «50 гадоў ВЛКСМ» — пазнаёміць з лепшымі творамі савецкіх мастакоў аб савецкай моладзі.

У Дзяржаўным музеі мастацтва народаў Усходу — дзве выстаўкі: «Жывапіс і графіка Савецкага Усходу», якая прадстаўляе творы мастакоў рэспублік Закаўказзя і Сярэдняй Азіі, і экспазіцыя «Калекцыі Бліжняга Усходу са старадаўнейшых часоў да XIX стагоддзя».

Дзяржаўныя музеі Маскоўскага Крамля пазнаёмяць гасцей фестывалю з абноўленай экспазіцыяй Музея быту XVII стагоддзя і новай экспазіцыяй Успенскага сабора, якая ўключае старажытна-рускі іконапіс, насценныя роспісы.

Мастацтва Поўначы будзе шырока прадстаўлена на выстаўцы «Жывапісам старажытнай Карэліі». Наведвальнікі ўбачаць каштоўнейшыя экспанаты Рускага музея Ленінграда, Петразаводскага музея, унікальнага музея Поўначы — Кіжоў.

АДН.

КРОК У ВЫШЭЙШЫ КЛАС

ЗАКОНЧЫЎСЯ РЭСПУБЛІКАНСКІ КОНКУРС МУЗЫКАНТАЎ-ВЫКАНАЎЦАЎ

Учора заключным канцэртам лаўрэатаў завяршыўся рэспубліканскі конкурс музыкантаў-выканаўцаў, які працягваўся дзесяць дзён у канцэртных залах Мінска, — кансерваторыі, сярэдняй спецыяльнай музычнай школе і філармоніі. Карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва» папрасіў старшыню журы конкурсу выканаўцаў на струнных інструментах загадчыка кафедры кансерваторыі дацэнта Мікалая Данілавіча Браценнікава расказаць пра гэты агляд.

— Асноўная мэта нашага конкурсу — выявіць найбольш таленавітую моладзь. Конкурс, які праходзіў напярэдадні вялікага свята беларускага народа і быў прысвечаны 50-гадоваму юбілею БССР і Кампартыі Беларусі, праведзены па праграме будучага Усесаюзнага конкурсу музыкантаў-выканаўцаў і Міжнароднага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага. Гэта патрабавала ад удзельнікаў сур'ёзнай, працаёмкай і карпатлівай работы і, відаць, таму склад удзельнікаў быў параўнаўча невялікі: дванаццаць скрыпачоў, чатыры віяланчэлісты і адзін альтыст.

Першае месца сярод скрыпачоў заняў Б. Хусід, канцэртмайстар Камернага аркестра філармоніі, які летась закончыў кансерваторыю па класе прафесара В. Гольфельда. Б. Хусід — скрыпач з ярка акрэсленай віртуознай асновай. Ён адносна роўна выступіў ва ўсіх трох турах, паказаў добрую тэхнічную падрыхтоўку і цікавыя музычныя якасці. Хацелася б адзначыць выкананыя ім на конкурсе Чацвёрты капрыс Паганіні, канцэрт Моцарта. Прыемнае ўражанне пакінула выкананне санаты Бетховена соль мажор (№ 8), асабліва другой часткі.

Другую прэмію заваявала студэнтка IV курса кансерваторыі Н. Жажэнка, якая займаецца пад маім кіраўніцтвам. Гэта мая даўняя вучаніца (яна займаецца ў мяне з пятага класа музычнай школы), таму я толькі спашлюся на выказванні маіх калег: аднагалосна былі адзначаны яе глыбокая музычнасць, правільнае, тонкае адчуванне стылю. Да найбольшых яе творчых удач можна аднесці Адажыо і фугу соль мінор Баха, «Мелодыю» Чайкоўскага, «Паэму» Шасона. Члены журы высока ацанілі вобразнае паэтычнае выкананне ёю Першага канцэрта Шыманоўскага, твора, які рэдка выконваецца і ставіць перад салістам вялікія музычныя і ансамблевыя задачы.

Трэцюю прэмію атрымала А. Прыцкер, асістэнт-стажор кансерваторыі, яркая ў віртуозных адносінах скрыпачка, з добрай штрыхавой тэхнікай.

Сярод віяланчэлістаў найбольш высокі ўзровень прадэманстраваў А. Алоўнікаў, студэнт IV курса (клас старшага выкладчыка Б. Скабло). Ён заваяваў дыплом І ступені. Алоўнікаў паказаў сябе і сур'ёзным музыкантам, і выдатным інструменталістам. Другое і трэцяе месца занялі таксама студэнты кансерваторыі Г. Кандрацюк (клас С. Мадорскага) і І. Гальдштэйн (клас Б. Скабло).

Праграма конкурсу прадугледжвала абавязковае выкананне твораў беларускіх кампазітараў. «Паэму» для скрыпкі Э. Тырманд выканала на конкурсе А. Прыцкер. Прыемнай нечаканасцю была п'еса «Рэчытатыў і скерца», напісаная літаральна днямі студэнткай аддзялення кампазіцыі кансерваторыі Д. Смаргонскай. П'есу, якая вызначаецца нетрадыцыйнай музычнай мовай, ярка і пераканаўча выканаў В. Бадз'яраў. У канцэртах конкурсу прагучала і «Андантэ» П. Падкавырава, напісанае пад ураканнем гераічнага подзвігу М. Гастэлы. Выканаўца Н. Жажэнка правільна адчула эмацыянальную афарбоўку гэтага твора, падкрэсліла глыбокі драматызм і настрой мужнага смутку. Па-майстэрску напісана для скрыпкі «Гумарэска» У. Алоўнікава знайшла сваё «другое жыццё» ў вельмі ўдалым пералажэнні для віяланчэлі Алега Алоўнікава, які і выканаў гэтую п'есу з сапраўдным запалам і бляскам.

Сярод тых, хто не трапіў у лік пераможцаў, варта адзначыць студэнта V курса В. Хадыку і студэнта IV курса В. Бадз'ярава. Гэта безумоўна здольныя скрыпачы з добрай перспектывай. Хачу таксама адзначыць вучняў сярэдняй спецыяльнай музычнай школы пры кансерваторыі Р. Крывеля (клас выкладчыка В. Чарныша) і Д. Левіна (клас дацэнта М. Гальдштэйна). Сам факт удзелу гэтых юнакоў у такім складаным конкурсе гаворыць аб тым, што ў недалёкім будучым, вядома, пры адпаведнай рабоце, яны змогуць дабіцца добрых вынікаў.

У заключэнне мне хочацца сказаць, што кожны конкурс — спаборніцтва, а ў спаборніцтве ёсць і пераможцы і пераможаныя. Характэрная асаблівасць нашага конкурсу — гэта тое, што ў нас, як кажуць, няма пераможаных, бо ўсе ўдзельнікі зрабілі вялікую работу, якая рушыла іх намнога ўперад на шляху фарміравання якасцей музыканта-выканаўцы.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

24 снежня

Першая праграма. 17-30 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Музычны церамок». Перадача з Пярмі. 18-00 — дзіцячы экран. «Алі-Баба і сорак разбойнікаў». Лялечны фільм. 18-30 — «Навіны». 18-50 — «Сярод добрых людзей». Мастацкі фільм. 20-30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-15 — фестываль фільмаў і спектакляў Беларускага тэлебачання. прысвечаны 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. «Біяграфія маёй рэспублікі». Фільм чацвёрты. «Агонь». 22-15 — «Родныя напевы». Фільм-канцэрт. 22-45 — рашэнні кастрычніцкага Пленума ЦК КПСС і лістападаўскага пленума ЦК КПБ — у жыццё. «Навуковую арганізацыю працы — у сельскую гаспадарку». Радыётэлевізійны лекторый. 23-15 — «Толькі факты». Праграма перадач. 23-25 — для студэнтаў вну. «Начартальная геаметрыя».

Другая праграма. 18-00 — «Стандартызацыя і прагрэс». Тэлевізійны часопіс (М). 18-30 — першынство СССР па валейболу. «Радыётэхнік» (Рыга) — ЦСКА. Перадача з Рыгі. 20-30 — «Нашы госці». Канцэрт піяністкі В. Жукавай. 21-00 — рэклама, аб'явы. 21-15 — аперэта К. Кацмана «Маркаў камень». Прэм'ера тэлевізійнага музычнага спектакля. Перадача са Свярдлоўска.

25 снежня

Першая праграма. 15-35 — школьная фільматэка. «Павел Карчагін». Мастацкі фільм. 17-20 — «Навіны». 17-30 — для школьнікаў. «Беларускія пісьменнікі». К. Буйла. 18-00 — для школьнікаў. «Жаваранак». Музычная праграма. Перадача з Таліна. 18-30 — праграма каляровага тэлебачання (М). 20-00 — «Здароўе». Тэлевізійны часопіс. 20-40 — «Хроніка музычнага жыцця рэспублікі. Год 1934-ы». 21-15 — фестываль фільмаў і спектакляў Беларускага тэлебачання. прысвечаны 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. «Біяграфія маёй рэспублікі». Фільм пяты. «Ад подзвігу да подзвігу». 22-15 — «На музычнай хвалі». Р. Гліер. «Гімн вялікаму гораду». 22-25 — «Беларусь святочная». Рэпартаж. 22-40 — за фасадам «свабоднага свету». «Актывізацыя рэваншысцкай палітыкі Бона». Выступленне доктара гістарычных навук М. С. Васленскага. 23-15 — «і сэрца тае...». Канцэрт.

Другая праграма 17-45 — «Піянерыя». Кіначасопіс (М). 19-30 — экран — завочнікам. Марксісцка-ленінская філасофія. «Матэрыя і асноўныя формы яе існавання». Лекцыя кандыдата філасофскіх навук А. У. Самускевіча. 20-00 — «Знаёмства з операй». П. І. Чайкоўскі. «Чаравічкі». Спектакль Пермскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета. Перадача з Пярмі. У перапынках — тэлевізійныя навіны (М). 23-25 — «Толькі факты». (М).

26 снежня.

Першая праграма. 17-35 — «Навіны». 17-45 — праграма перадач. 17-50 — школьная фільматэка. «Старонкі вялікай дружбы. Дакументальны фільм. 18-20 — да 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі. Для школьнікаў. «Рэха». Тэлевізійны часопіс. 19-00 — «Чатыры старонкі аднаго маладога жыцця». Мастацкі фільм (М). 20-30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-15 — фестываль фільмаў і спектакляў Беларускага тэлебачання. прысвечаны 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. «Біяграфія маёй рэспублікі». Фільм шосты. «Дарога ў заўтра». 22-15 — «Навагоднія віншаванні». Фільм-канцэрт. 22-40 — «Беларусь святочная». Рэпартаж. 23-00 — «Толькі факты». Праграма перадач. 23-10 — «Твае аднагодкі». Канцэрт.

Другая праграма. 11-00 — першынство СССР па хакеі з мячом. СКА (Свярдлоўск) — «Дынама» (М). Перадача са Свярдлоўска. 12-45 — праграма каляровага тэлебачання (М). 17-05 — тэлевізійныя навіны (М). 17-15 — літаратурны тэатр. Я. Смелякоў. «Строгае каханне». (М). 18-00 — для школьнікаў. «Сто задум двух сяброў» (М). 18-30 — «Зорка героя». Тэленарыс (М). 20-00 — экран — завочнікам. Навуковы камунізм. «Заканамернасць перарастання сацыялізма ў камунізм». Лекцыя кандыдата гістарычных навук І. С. Сялічкіна. 20-30 — экран — завочнікам. Палітычная эканомія. «Пазыковы капітал і пазыковы працэнт». Лекцыя кандыдата эканамічных навук В. М. Касцянка. 21-15 — першынство СССР па хакеі з мячом. СКА (Свярдлоўск) — «Дынама» (М). У запісе (М). 22-00 — канцэрт Маскоўскага камернага аркестра пад кіраўніцтвам Р. Баршая (М).

500 ГОД ЧЭШСКАЙ КНІГІ

Чэхаславакія шырока адзначае выдатную дату ў гісторыі сваёй культуры — 500 год назад выйшла першая друкаваная кніжка на чэшскай мове — «Траянская хроніка», якая паклала пачатак багатым традыцыям чэшскага кнігадрукавання. «Траянская хрочіка» была выдадзена ў Пльзені ў тыя часы, калі чэшскі трон займаў адзін з найбольш вядомых і слаўных каралёў Іржы Падзебрадскі, ініцыятар стварэння міждзяржаўнай арганізацыі з мэтай мірнага сужыцця — нейкай папярэдніца Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Як мяркуюць чэшскія вучоныя, першадрукаром (імя яго засталося невядомым) быў, відаць, адзін з вучняў вядомага І. Гутэнберга.

Варта падкрэсліць, што першая кніга на чэшскай мове была свецкай і белетрыстычнай. Яна выйшла раней, чым першыя кнігі ў Парыжы, Будапешце, Кракаве, Валенсіі, Вестмінстары, Вене, Лісабоне і іншых гарадах.

Да юбілейнай даты чэхаславацкія выдавецтвы выпусцілі ў свет альбом «Пяць стагоддзяў чэшскага кнігадрукавання», спецыяльныя кнігі, брашуры. У гэтых выданнях падкрэсліваецца і значэнне дзейнасці беларускага асветніка і гуманіста Францыска Скарыны, які надрукаваў сваю першую кнігу ў Празе Чэшскай.

Францішак Горак у прадмове да кнігі-альбома «Пяць стагоддзяў чэшскага кнігадрукавання» (зазначым, дарэчы, што тэкст надрукаваны на чэшскай, рускай, нямецкай і англійскай мовах) піша: «Выдатным эпізодам у гісторыі пражскага кнігадрукавання з'яўляецца дзейнасць беларускага друкара Францыска Скарыны, які ў 1517—1519 гг. пераклаў асобныя раздзелы бібліі і выдаў іх, выкарыстаўшы для набору кірыліцу і больш сучаснае афармленне, чым друкарні Севярына і Конча... Яго выданні вызначаюцца высокім друкарскім узроўнем».

Партрэтам Ф. Скарыны адкрываецца густоўна афармлены кішэннага фармату альбом партрэтаў самых вядомых дзеячоў кнігадрукавання ў Чэхаславакіі.

І. БАРЭЙКА.

ЦЫРК

У Беларускім цырку адбылася прэм'ера святочнай праграмы «Красуй, Радзіма-Беларусь!». У гэтай праграме прынялі ўдзел як вядучыя майстры савецкага цырка, так і моладзь, выпускнікі студыі пры Беларускім цырку.

На здымках нашага фотакарэспандэнта У. Крука вы бачыце маладога беларускага артыста М. Кузняцова — жанглёра на вольным дроце і нашу госцю І. Адаскіну з групай дрэсіраваных мядзведзяў.

ПАМЯЦІ В. А. ЛЯВІЦКАЙ

17 снежня г.г. на 73-м годзе жыцця памёрла Ванда Антонаўна Лявіцкая, старэйшая беларуская пісьменніца, дачка вядомага празаіка Ядвігіна Ш.

Нарадзілася Ванда Антонаўна ў 1895 годзе ў мястэчку Радашковічы былой Віленскай губерні. Там жа скончыла вышэйшую пачатковую школу. Рыхтавалася да здачы экзамена на настаўніцу сельскай школы, аднак імперыялістычная вайна перашкодзіла гэтаму.

У 1909—1915 гг. актыўна супрацоўнічала ў газеце «Наша ніва»: выступала з апавяданнямі («Бацькаўшчына», «Сумна шуміць старушка ліпа» і інш.) і вершамі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі апублікавала ўспаміны пра бацьку. З 1930 года жыла ў Ліпецку.

Ванда Антонаўна Лявіцкая пражыла нялёгкае жыццё, увесь час застаючыся сціплым і самаадданым працаўніком на ніве роднай культуры.

Л. ГОЛУБЕВА,
кандыдат філалагічных навук.

У РЭДАКЦЫЮ ГАЗЕТЫ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Прашу праз вашу газету перадаць глыбокую ўдзячнасць усім арганізацыям і таварышам, якія павіншавалі мяне з сямідзесяцігоддзем.

М. АЛЯКСЕЕЎ.

20 снежня 1968 года.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармац